ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

№ 210 (3318) Субота 14-га верасьня 1929 г.

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, намгатар—619, кантора—781

У ГАДЗ. НОЧЫ:

МАСКВА, 13. Народны Камісаріят па Замежных справах атрымаў 11 верасьня праз нямецкае пасольства ў Маскве адказ кітайскага ўраду на прапанову ўраду СССР падпісаць сумесную дэклярацыю. Згаджаючыся склікаць савецка-кітайскую канфэрэнцыю ў Бэрліне, нанкінскі ўрад паведамляе, што ён „ня можа згадіцца з некаторымі прапановамі савецкай ноты".

АПОШНІЯ НАВІНЫ Б. С. С. Р.

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). Па ініцыятыве парт'ячэйкі І рабочай брыгады заводу імя Домбаля сяляне Забашэвіцкага і Лазінскага сельсаветаў арганізавалі чырвоны абоз з хлебам. Усяго эдана па гэтых двух сельсаветах у крэдытнае таварыства 500 пудоў эбожжа на індустрыя лізацыю краіны.

СУПРОЦЬ АДНЭЙ КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ ЛЕГЭНДЫ

Пасьпяховае разьвіцьцё сацыялістычнага наступленьня па капіталістычныя элемэнты ў нашай краіне робіць вялізныя перасоўкі ў асяродзінчы інтэлігенцыі.

Сацыялістычнае наступленьне зьявілася тым асялком, па якім прабуецца ступень адданасьці з боку гэтай пралёйкі нашага грамадзтва справе рабочае клясы.

Кажучы іншымі словамі—адбываецца далейшая з усё больш і больш узмоцненым тэмпам дыфэрэнцыяцыя інтэлігенцыі.

На адным полюсе зьбіраецца тая частка інтэлігенцыі, якая прышла да савецкае ўлады «з каменем за пазухай», якая ўсе свае надзеі ўскладала на наш «мірны спуск на тармазох». Гэта частка цяпер, у момант абвастрэньня клясавай барацьбы, актывізуецца, прабуе ідэалёгічна стаць на чале кулака і нэпмана, якія шалёна абараняюцца, а часамі і наступаюць.

Гэта частка інтэлігенцыі скарыстоўвае сваё службовае становішча, розныя пасты і вышыні, якія яна займае ў савецкім мэханізьме ў інтарэсах кулака і нэпмана і супроць дыктатуры пралетарыяту. Гэтай яе «рабоце» дапамагаюць правыя апартуністы і прымірэнцы ў нашых уласных радох, усе тыя, хто ня здольны з усёй сілай змагацца за выразную клясавую лінію на ўсіх вучастках нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Простае шкодніцтва і розныя скажэньні клясавай лініі ў рабоце самых рознастайных нашых апаратаў, аб чым так шмат за апошні час выкрыта фактаў, зьяўляюцца ў вялізнай ступені простым вынікам такой «работы» гэтай часткі інтэлігенцыі.

У нашай шматнацыянальнай рэспубліцы выступленьні гэтай часткі інтэлігенцыі часта афарбоўваюцца яшчэ і ў розныя нацыянал-дэмакратычныя, шавіністычныя колеры, а прарывы на розных вучастках будаўніцтва дапаўняюцца атакамі з боку гэтай часткі інтэлігенцыі па нацыянальную палітыку партыі.

Наша задача ў адносінах да гэтай часткі інтэлігенцыі: барацьба, барацьба і яшчэ раз барацьба.

Барацьба бязьлітасная і тым у нашых уласных радох, хто ня хоча або не разумее неабходнасьці ўдараў па гэтай частцы інтэлігенцыі, хто паспрабуе гэтыя ўдары так або інакш паслабіць, хто па меркаваньнях бесьпрынцыповага дзяляцтва гатоў і далей ісьці «па шляху уступак» гэтай частцы інтэлігенцыі.

Мы павінны мабілізаваць усю ўвагу, усю пільнасьць мас па вырашэньне гэтай задачы.

Мы павінны таксама ў шмат разоў узмацніць тэмп вылучэньня і падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў для ўсіх франтоў сацыялістычнае будовы.

Толькі **такім** шляхам мы зможам забясьпечыць бесьперабойны, пераможны ход сацыялістычнага наступленьня ўсё ўперад і ўперад.

Але сёньня і іншая, пераважна большая частка інтэлігенцыі, якая і раней сумленна служыла рабочай клясе і цяпер, у момант абвастрэньня клясавай барацьбы, у момант узмацненьня сацыялістычнага наступленьня, нага ў нагу з пралетарыятам з усім энтузіязмам працягвае цяжкую працу па сацыялістычным перабудаваньні нашага грамадзтва.

Пераважная большасьць інтэлігенцыі ў нашай шматнацыянальнай рэспубліцы чужая да нацыянал-дэмакратычных і шавіністычных настрояў, якія расьцьвілі такой пышнай кветкай. Яна чужая для таго пласту інтэлігенцыі, аб якім мы гаварылі вышэй. У сваёй масе інтэлігенцыя БССР правільна зразумела значэньне ўзмацненьня сацыялістычнага наступленьня і правільна праводзіць нацыянальную палітыку нашай партыі і савецкай улады.

Да гэтай часткі інтэлігенцыі ў нас ня можа быць іншых адносін, як самых прыяцельскіх, самых таварыскіх, адносін усялякага садзейнічаньня і ўсялякае дапамогі.

Больш увагі, больш клопатаў, больш пабліжэньня гэтай часткі інтэлігенцыі да справы сацыялістычнага будаўніцтва і больш нашай выхаваўчай работы сярод гэтых пластоў інтэлігенцыі.

Зараз, калі мы вядзем узмоцненае сацыялістычнае наступленьне на эканамічным і ідэалёгічным франтох, калі мы выкрываем усіх тых, хто ў нашых апаратах прабаваў і прабуе служыць клясаваму ворагу, калі мы бязьлітасна выкідаем і будзем выкідаць гэтыя элемэнты, сапраўды «ня гледзячы на асобы», з усіх вучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва, дзе яны заселі, сяму-таму выгодна распаўсюджваць легэнду аб тым, нібы партыя абвясьціла «паход» на інтэлігенцыю.

Такую контр-рэвалюцыйную легэнду клясавы вораг зараз сьпяшаецца складаць і пашыраць. Папярэньне яе разьлічана на тое, каб унесьці сумяціцу ў рады інтэлігенцыі, каб пасеяць недавер'е да савецкае ўлады і камуністычнае партыі, каб клясавы вораг тым лягчэй мог павудзіць рыбку ў гэтай каламутнай вадзе.

Але гэты нумар ня пройдзе.

Гады рэвалюцыі не прайшлі дарма. Масы дасканала навучыліся бачыць —хто прыяцель і хто вораг.

Інтэлігенцыя ў масе дасканала разьбіраецца ў палітыцы партыі і не паддасца на правакацыю клясавага ворага. Наадварот, выкрытыя факты скажэньняў пралетарскае клясавае лініі, факты шкодніцтва, нацыянал-дэмакратычныя і шавіністычныя наскокі на нашу нацыянальную палітыку толькі глыбей рыюць яму паміж асноўнымі масамі інтэлігенцыі і яе нацыянал-дэмакратычнымі нацыянал-буржуазнымі пластамі.

Усе гэтыя факты лішні раз паказваюць асноўнай масе працоўнай інтэлігенцыі, што тоіцца пад рознымі пышнымі «нацыянальнымі» лёзунгамі.

Твар клясавага ворага ў гэтых выступленьнях выявіўся ва ўсёй сваёй агіднасьці. Гэты твар ня прывабіць да сябе сымпатый масы нашай інтэлігенцыя, якая кроўна зьвязана са справай рабочае клясы.

Колькі-б не стараліся паны нацыянал-дэмакраты, якія легэнды і казкі яны-б не стваралі, сымпатыі інтэлігенцкае масы будуць на баку не кулака і нэпмана, а на баку рабочае клясы Беларусі, якая ў саюзе і пры падтрыманьні пралетарыяту ўсёй савецкай краіны з посьпехам умацоўвае сваю дыктатуру ў БССР.

Ангельская нота СССР

Перагаворы аб аднаўленьні адносін паміж ангельскім і савецкім урадамі назначаны на 24-га верасьня ў Лёндане

Часовы паверены ў справах Нарвэгіі Даніэльсэн 10-га верасьня нотай на імя тав. Літвінава паведаміў, што брытанскі ўрад прымае да ведама заяву тав. Літвінава ў Маскве 6-га верасьня адносна аднаўленьня адносін паміж брытанскім і савецкім урадамі і прапануе 24-га верасьня і Лёндан, як дату і месца для спатканьня з прадстаўнікамі ўраду СССР для перагавораў.

Тав. Літвінаў паведаміў 12-га верасьня Даніэльсэну наступнае:

«Урад СССР прымае да ведама паведамленьне брытанскага ўраду, у якім ён, спасылаючыся на маю заяву ад 6-га гэтага месяца, запрашае саюзны ўрад зноў паслаць упоўнаважанага ў Лёндан на 24-ае верасьня для перагавораў. Саюзны ўрад згаджаецца паслаць у Лёндан на назначаны дзень прадстаўніка з адпаведнымі поўнамоцтвамі. Дакладны час і ангельскі порт прыбыцьця ўпоўнаважанага саюзнага ўраду будуць паведамлены дадаткова».

Заява тав. Літвінава прадстаўніку ТАСС

У адказ на запытаньне прадстаўніка ТАСС, ці мяркуе народны камісар замежных спраў паставіць у прэзыдыуме ЦВК СССР пытаньне адносна аднаўленьня адносін з Вялікабрытаніяй, згодна ноце брытанскага ўраду ад 31-га ліпеня, часова выконваючы абавязкі наркома замежных спраў тав. Літвінаў даў наступнае растлумачэньне:

«Імкненьне да аднаўленьня і захаваньня нармальных адносін з усімі дзяржавамі зьяўляецца складанай часткай мірнай палітыкі саюзнага ўраду, якая атрымала ня раз ухвалу ЦВК СССР і ўсесаюзных зьездаў саветаў. У інтарэсах паскарэньня аднаўленьня адносін з Вялікабрытаніяй НКЗС, згодна пастанове саюзнага ўраду, прыняў сваёй нотай ад 23-га чэрвеня прапанову п. Гэндэрсона аб папярэднім абмеркаваньні пытаньняў працэдуры, без перагавораў па спрэчных паміж зводвума бакамі пытаньнях, якія павінны мець месца пасьля аднаўленьня нармальных адносін. Паколькі, згодна нядаўняй заявы п. Гендэрсона ў друку і яго апошняй ноты, зараз зноў ставіцца пытаньне толькі аб абгаварэньні працэдуры, НКЗС лічыць магчымым зноў паслаць для гэтае мэты ў Лёндан упоўнаважанага на падставе вышэйназванае пастановы саюзнага ўраду, бо вырашэньне гэтага пытаньня не патрабуе дадатковых інструкцый ад прэзыдыуму ЦВК СССР». (ТАСС).

Брыян выкладае свой праект фэдэрацыі Э. Ш. Эўропы

Нават гэтая жывёліна брыкаецца

Супроць правакацый і белага тэрору ў фашысцкай Польшчы

«Дзеньнік Віленскі» у № 208 піша: «Беларускі Сялянска-Работніцкі пасольскі клюб ухваліў па аднаўленьні сэсіі сойму ўнесьці шэраг інтэрпэляцый, а іменна: у справе арыштаў павятовых сакратароў у доме № 3 па вул. Піўной у Вільні, арышту членаў ТБШ у Горадні, мітынгу пасла Валынца ў вёсцы Рацэвічы, Вялейскага павету, зачыненьня акруговых управаў ТБШ, а таксама разгону зьезду членаў ТБШ у Косаве, на якім пасол Грэцкі прабаваў агаласіць антыдзяржаўную рэзалюцыю.

Адначасова гэты клюб выступіць з прапановаю вотуму недавер'я міністру ўнутраных спраў генэралу Складкоўскаму і ваяводам Беластоцкаму, Палескаму, Наваградзкаму і Віленскаму».

***

Польскі фашызм, які шалёным тэмпам рыхтуецца да вайны супроць СССР, з усіх сіл імкнецца да задушэньня нац.-рэвалюцыйнага руху працоўных мас Зах. Беларусі, каб такім чынам падрыхтаваць сабе тыл у будучай вайне.

Ужо з вясны г. г., калі выявілася нарастаньне рэвалюцыйнай барацьбы рабочае клясы і працоўных мас сялянства, акупанцкая ўлада пачала падрыхтоўчую кампанію на разгрому Беларускага Рабоча-Сялянскага клюбу. У рух быў пушчаны выпрабаваны мэтад фашысцкага ўраду—правакацыя. І вось 25 жніўня, як ужо падавалася ў «Зьвязьдзе» віленская паліцыя зрабіла налёт на Сакратарыят Беларускага Рабоча-Сялянскага соймавага клюбу і арыштавала 16 чалавек, якія знаходзіліся ў памяшканьні Сакратарыяту. Як вядома з прычыны гэтага фашысцкі друк пачаў тады трубіць аб арышце камуністычнай канфэрэнцыі, пачалося цкаваньне гэтых паслоў, а Віленская манархічная газэта «Слово» патрабавала прыняцьця рашучых мер супроць нац.-рэвалюцыйнага руху, арышту паслоў і ўзмацненьня тэрору. Гэтыя арышты ў Вільні аж надта выразна паказваюць на новую буйную правакацыю паліцыі ў адносінах да Белар. Рабоча-Сялянскага пасольскага клюбу і кіраўніцтва ТБШ. Яны сьведчаць аб тым, што польскі фашызм пры дапамозе беларускіх нац.-фашыстых — Луцкевічаў, Астроўскіх прыступіў да рэалізацыі сваіх плянаў—**да канчатковага разгрому цэнтральнага кіраўніцтва ТБШ, да падрыхтоўкі разгрому Белар. Рабоча-Сялянскага клюбу і арышту яго дэпутатаў.**

У гэтых-жа мэтах—душэньня нац.-рэвалюцыйнага руху ў Зах. Беларусі пры дапамозе тых-жа мэтадаў—правакацыі былі разгромлены акруговыя ўправы ТБШ у Горадні і Сьвіслачы—у Гарадзеншчыне, разгон зьезду ТБШ у Косаве, дзе нібы пасол Грэцкі прабаваў агаласіць антыдзяржаўную рэзалюцыю, і арыштаваны члены акруговай управы ў Горадні Н. Ламашэвічанка, Баліцкі і Кізевіч.

Але польскаму фашызму мала было гэтага. Ён арганізоўваў замахі сярод бетага соймавага клюбу. Так у м. Карэлічы ў Вільні, а ў вёсцы Рацэвічы, Вялейскага павету. У часе справаздачнага мітынгу пасла Валынца паліцэйскімі агентамі быў сьмяротна паранены селянін Варановіч.

Усіх тэрарыстычных актаў азьвярэлых агентаў польскага фашызму ў адносінах да паслоў Бел. Рабоча-Сялянскага клюбу і не пералічыць.

ЧЫСТКА ДЗЯРЖАПАРАТУ---ЦЭНТРАЛЬНАЯ ЗАДАЧА ЯЧЭЕК НА БЛІЖЭЙШЫ ПЭРЫЯД

Прыцягнуць да чысткі апарату шырокія рабочыя масы

Рашуча ўдарыць па тых, хто пасыўна адносіцца да чысткі, хто процідзейнічае або перашкаджае чысткі дзяржапарату

(Рэзалюцыя ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб ходзе праверкі і чысткі дзяржапарату)

МАСКВА, 12. Заслухаўшы паведамленьне аб ходзе праверкі і чысткі дзяржапарату, ЦК і ЦКК УсеКП(б) канстатуюць, што ўжо першыя вынікі гэтай работы паказваюць, што савецкія, прафэсыянальныя і партыйныя арганізацыі, у тым ліку і мясцовыя органы РСІ, не ўсьвядомілі ў выстарчальнай меры вялізнага значэньня чысткі дзяржапарату ў справе вызваленьня апарату ад злосных чыноўніцка - бюракратычных элемэнтаў, уцягненьня замест іх новых кадраў рабочых і барацьбы за больш выразную клясавую лінію ў дзяржапараце і ня ўлічылі труднасьцяй, зьвязаных з правядзеньнем чысткі. У выніку гэтага якасьць праверкі і чысткі дзяржапарату зусім не забясьпечвае выкананьня вышэйзазначаных задач. ЦК і ЦКК УсеКП(б) падкрэсьліваюць, што вызваленьне дзяржапарату ад злосных чыноўніцка - бюракратычных элемэнтаў ня можа быць праведзена сіламі толькі аднэй РСІ, а павінна быць справай усёй партыі, прафсаюзаў, усяе рабочае клясы. Партыйныя арганізацыі павінны ўдзяліць увагу чысткі савецкага апарату ў такой-жа меры, як і чысткі партыі. Для зьяўленьня выяўленых у працэсе праробленай работы па чысткі і праверцы дзяржапарату недахопаў ЦК і ЦКК прапануюць:

1. З прычыны наяўна слабога ўдзелу шырокіх мас у чысткі і праверцы дзяржапарату і зусім невыстарчальнай мабілізацыі іх вакол асноўных палітычных і практычных задач чысткі, **усім партыйным, прафсыянальным і савецкім арганізацыям, а таксама друку згуртаваць сваю ўвагу на максымальным прыцягненьні да чысткі і праверкі шырокіх рабочых мас і перш за ўсё шырокага актыву масавых арганізацый (прафактыў, удзельнікі сэкцый саветаў, атрады лёгкай кавалерыі, работніцы-дэлегаткі) і актыву ўстаноў, якія праяраюцца.** У прыватнасьці, трэба пашырыць практыку стварэньня рабочых брыгад для праверкі работы апарату, прыцягваючы ўдзельнікаў гэтых брыгад да найбольш актыўнага ўдзелу ў непасрэднай праверцы работы і чысткі савецкіх устаноў. **У асаблівасьці ЦК і ЦКК УсеКП(б) лічыць патрэбным паказаць на разыходжаньне паміж словам і справаю ў камсамоле і яго ўдзел у чысткі дзяржапарту. Камсамол, які разгортвае асабліва энэргічную і патрэбную крытыку, не павінен абмяжоўвацца толькі крытыкай, але і прымаць актыўны і дзелавы ўдзел у выпраўленьні недахопаў дзяржапарату.** Даручыць ЦК УсеЛКСМ распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па ўцягненьні мас моладзі ў гэту работу.

2. Чыстка і праверка савецкага дзяржапарату непарыўна зьвязана з задачай **ажыўленьня дзейнасьці саветаў і пашырэньня іх работы.** Між тым гэта работа пакуль праходзіць міма саветаў, бо саветы і інспэкцыі прымаюць крайне слабы ўдзел у чысткі і праверцы дзяржапарату. Таму ЦК і ЦКК УсеКП(б) лічаць, што чыстка дзяржапарату павінна заняць адно з цэнтральных месц у рабоце саветаў і іх выканкомаў. Камісіі па чысткі павінны ўстанавіць больш цесную сувязь і ўзаемадзейнасьць з саветамі і іх выканкомамі, прыцягваючы да непасрэднага і практычнага ўдзелу да чысткі і праверкі паасобных устаноў зьвязаныя з імі сэкцыі саветаў і агульны рабочы актыў.

3. ЦК і ЦКК УсеКП(б) канстатуюць, што кіраўнікі раду савецкіх устаноў часта праяўляюць недапушчальна пасыўныя адносіны да чысткі сваіх устаноў і не дапамагаюць органам РСІ. ЦК і ЦКК УсеКП(б) **мяркуюць,** што ступень удзелу кіраўніка ўстановы ў чысткі і дапамозе чысткі павінна зьяўляцца паказальнікам разуменьня ім задач, што стаяць перад партыяй і яго прыдатнасьці, як кіраўніка данае ўстановы. **Кіраўнікі, якія адносяцца пасыўна да чысткі, а тым больш у тых або іншых формах ёй процідзейнічаюць, павінны прыцягвацца да адказнасьці аж да зьняцьця іх з работы.**

4. Савецкія і партыйныя ячэйкі, а таксама мясцкомы прафсаюзаў не паставілі правядзеньне чысткі ў цэнтры сваёй дзейнасьці і не разгарнулі пытаньні чысткі ў даволі глыбокае і дзелавое вывучэньне дзяржапарату і намячэньне мерапрыемстваў па вынішчэньні недахопаў. Між тым, савецкія ячэйкі павінны лічыць для сябе чыстку цэнтральнай і вытворчай асноўнай задачай бліжэйшага пэрыяду і павінны па гэтай задачы ў асноўным будаваць увесь свой плян работы, мабілізуючы ўвесь як партыйны, так і беспартыйны актыў супрацоўнікаў устаноў.

5. Ня гледзячы на тое, што згодна пастанове партыйнай канфэрэнцыі, чыстка павінна адбывацца пры бліжэйшым удзеле прафсаюзаў, бо чыстка і праверка дзяржапарату ёсьць работа і непасрэдны сродак паляпшэньня работы мас, прафсаюзы не зьвярнулі належнае ўвагі на гэту работу, абмежаваўшыся фармальным удзелам сваіх прадстаўнікоў у рабоце камісій. Таму ЦК і ЦКК УсеКП(б) прапануюць фракцыі УсеЦСПС вызначыць рад канкрэтных мерапрыемстваў па ўзмацненьні ўдзелу прафсаюзаў у чысткі і праверцы дзяржапарату і, асабліва, ўзмацніць работу мас у гэтай чысткі. Гэта адносіцца, у першую чаргу, да індустрыяльных саюзаў і саюзу саўгандальслужачых. У мэтах большага ўцягненьня мас у работу па праверцы і чысткі савецкага апарату практыкаваць выезды на фабрыкі і заводы камісій па чысткі і работнікаў, якія імі мабілізуюцца, са справаздачамі аб ходзе чысткі дзяржапарту, а таксама асьвятляць перад сялянствам ход чысткі і праверкі цэнтральных і абласных дзяржапаратаў як шляхам выездаў, так і праз друк.

6. ЦК і ЦКК УсеКП(б) лічаць, што органы РСІ павінны вызначыць рад практычных мерапрыемстваў і так паставіць работу камісій па чысткі (забясьпечыўшы іх неабходным складам найбольш кваліфікаваных работнікаў), каб яны **арганічна** ўцягвалі ў работу па чысткі ўсе асноўныя масавыя арганізацыі. Разам з тым, неабходна цэнтр цяжару чысткі перанесьці з колькаснага размаху на якасны бок работы, не раскідаючы чыстку па розных установах, а сканцэнтраваўшы яе на важнейшых кутох, пераходзячы ад аднаго да другога, прычым у першую чаргу трэба ўзяць установы, зьвязаныя больш за ўсё ў работе з правядзеньнем гэтай лініі і з патрэбамі мас. **У гэтых мэтах і ЦКК УсеКП(б) лічаць мэтазгодным сканцэнтраваць работу па чысткі ў бліжэйшы пэрыяд на органе Наркамфіну і Наркамзему, кожныя тры месяцы заслухоўваючы дакалды аб ходзе чысткі ў іх.**

7. ЦК і ЦКК УсеКП(б) падкрэсьліваюць, што ва ўсёй рабоце па чысткі і праверцы дзяржапарату трэба выходзіць з таго, што чыстка мае на мэце якаснае паляпшэньне дзяржапарату за кошт уцягненьня новых сьвежых пралетарскіх часьцей у дзяржапараце на месцы вычышчаных. Таму ЦК і ЦКК УсеКП(б) лічаць, што ўжо ў пачатку чысткі неабходна рыхтаваць рэзэрвы з моладзі, студэнцкай і камсамольскай, рабочых ад варштату, ніжэйшых служачых для прасоўваньня іх у дзяржапарат на месцы вычышчаных. Кіраўнікі ўстаноў пры ўдзеле Камісіі па чысткі павінны арганізаваць кароткатэрміновыя курсы па падрыхтоўцы патрэбных рэзэрваў. У замяшчэньні пасад павінны прыняць удзел прадстаўнікі камісіі па чысткі, прафсаюзаў і партыйнай арганізацыі.

Палітычны працэс у Лідзе

ВІЛЬНЯ, 9. Выязная сэсія Віленскага акругога суду разгледзела ў Лідзе справу 7 жыхароў Лідчыны і аднаго рабочага з Варшавы, абвінавачаных у камуністычнай дзейнасьці. Да суду абвінавачаныя прасядзелі па паўтары гады ў турме.

Пры перавозцы падсудных на пасяджэньне суду ўсе яны былі закаваны ў кайданы, не зважаючы на энэргічнае супраціўленьне і пратэсты.

Справа слухалася пры зачыненых дзьвярох. А. Стрыхэр (Фрыдман) засуджаны на 6 гадоў катаргі, Р. Блох—на 4 гады, А. Любэцкі і Х. Абрамовіч—на 4 гады са зьмяншэньнем тэрміну на палову па амністыі, як няпоўнагадовы. Б. Троцкі—на 3 гады, В. Дзякевіч—на 1 год. Усім залічаны папярэдні арышт. Двое апраўданы. («К. Віл.»).

Англія не адмовіцца ад мандата на Палестыну

ЛЁНДАН, 12. Агэнцтва Рэйтэр падае з Ерусаліма: «Згодна апошняму ўрадавому паведамленьню, становішча ў Палестыне настолькі ўмацавалася, што згрупаваньне раскіданых раней войск працягваецца і частка іх можа быць перакінута ў партовыя гарады Яфу і Хайфу. Высаджаныя там атрады морскай пяхоты варочаюцца на судны і застануцца на іх, покуль становішча ня ўзмоцніцца настолькі, што адыход іх стане магчымым. Унутры краіны застанецца зусім здавальняючая колькасьць войск». (ТАСС).

***

Л�ёНДАН, 12. Міністар калёніі лёрд Пасфільд (Сіднэй Вэбб) прыняў дэпутацыю прадстаўнікоў адміністрацыйнае рады яўрэйскага агэнцтва (эміграцыйнага камітэту і генэральнае рады сіяністкай арганізацыі). Адказваючы дэпутацыі, Пасфільд запэўніў яе, што Англія не адмовіцца ад мандату на Палестыну і ня зьменіць палітыкі, якая дапамагае наладжаньню нацыянальнага вогнішча для яўрэйскага народу ў Палестыне. Пасфільд дадаў, што паліцэйскія сілы ў Палестыне ўзмоцнены назначэньнем паліцэйскіх, завербаваных у Англіі. Новыя вайсковыя часьці, якія ўведзены ў Палестыну ў зьвязку з непарадкамі, будуць эвакуаваны толькі ў тым выпадку, калі будзе прызнана, што іх можна адазваць бяз страты грамадзкага парадку». (ТАСС).

НЯМЕЦКАЯ САЦ.-ДЭМАКРАТЫЯ НА ВАРЦЕ ІНТАРЭСАЎ БУРЖУАЗІІ

ЗАКОНАПРАЕКТ АБ ГРАБЯЖЫ БЕСПРАЦОЎНЫХ

Паводле вестак газэт, магчыма, што яшчэ ў верасьні будзе склікана сэсія рэйхстагу для прыняцьця законапраекту аб страхаваньні ад беспрацоўя (які значна скарачае дапамогу беспрацоўным). Па словах «Бэрлінэр Лёкаль Анцэйгэр», у парляманцкіх колах лічаць, што партыі ўрадавай кааліцыі прымуць пры абмеркаваньні законапраекту папраўку, якая прапануецца партыяй цэнтру. Згодна гэтае папраўкі, беспрацоўны атрымлівае права на дапамогу толькі пасьля году беспрацоўя. Гэтае новае пагоршаньне дапамогі па беспрацоўі надзвычайна пяяка адаб'ецца на сотнях тысяч беспрацоўных. (ТАСС).

Дэманстрацыя саюзу чырвоных франтавікоў у Лейпцыгу

БЭРЛІН, 11. У Лейпцыгу адбылася дэманстрацыя ўсёй Лейпцыгскай арганізацыі саюзу чырвоных франтавікоў. У адзін і той-жа час ва ўсіх кварталах гораду выступілі атрады дэманстрантаў у поўнай форме. Дэманстрацыя працягвалася паўгадзіны, пры чым рабочае насельніцтва Лейпцыгу бурна вітала дэманстрантаў. (ТАСС).

Дэлегацыя нямецкіх рабочых у СССР на Кастрычнікавыя ўрачыстасьці

БЭРЛІН. 11. Агульна-нямецкі камітэт саюзу прыцеляў СССР публікуе адозву, у якой заклікае ўсіх працоўных пасланьць у СССР самых актыўных і лепшых клясавых байцоў для ўдзелу ў сьвяткаваньні 12-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі. Як зазначаецца ў адозьве, дэлегацыя павінна складацца са звыш 100 чалавек. (ТАСС).

Рабочыя Францыі кляймяць апазыцыю

ПАРЫЖ, 10, Рух радавой масы членаў унітарнай канфэдэрацыі працы супроць апартуністычнай апазыцыі набывае ўсё больш і больш моцны характар. Пастуае шмат рэзалюцый, ухваленых на мясцох, у якіх рабочыя кляймяць апазыцыю і заўзяляюць аб сваёй вернасьці Прафінтэрну і унітарнай канфэдэрацыі. Надзвычайны зьезд парыскіх мэталістых выказаўся за генэральную лінію унітарнай канфэдэрацыі і за безагаворачнае супрацоўніцтва з кампартыяй. Землякопы Парыскага раёну ўхвалілі такую-ж рэзалюцыю. Докеры Бордо, ня гледзячы на тое, што абодвы сакратары фэдэрацыі зьяўляюцца апазыцыянэрамі, выказаліся за генэральную лінію унітарнай канфэдэрацыі. (ТАСС).

НА ТЭМЭШВАРСКІМ ПРАЦЭСЕ

Поўны правал абвінавачаньня

ВЕНА, 12. На Тэмашварскім працэсе скончыўся допыт сьведкаў. Сьведкі абвінавачаньня канчаткова заблыталіся і большасьць іх была вымушана пацьвердзіць, што паліцыя катавала абвінавачаных. У зьвязку з гэтым пракурор запрапанаваў старшыні суду забараніць абвінавачаным задаваць сьведкам пытаньні аб катаваньнях. У абвінаваўчай прамове пракурор быў прымушаны, з прычыны поўнага маральнага правалу абвінаваўчага акту, адмовіцца ад абвінавачаньня ў забойстве з намерам і патрабаваў асуджэньня абвінавачаных за супраціўленьне ўладам нібы зробленае імі.

Ад абвінавачаньня 6-ці падсудных пракурор адмовіўся.

Як падаюць з Бухарэсту, там адбылася камуністычная дэманстрацыя супроць урадавага тэрору і камэдыі суду ў Тэмашвары. Былі чутны выклікі: «Няхай жыве СССР!» «Прэч падрыхтоўку імпэрыялістычнай вайны!» Паліцыя абкружыла дэманстрантаў і затрымала 20 чалавек, якія будуць адданы пад суд.

Міністар унутраных спраў Іоэнэцэску, які прыехаў на Тэмэшварскі працэс, заявіў журналістым, што супроць камуністычнага руху будуць ужыты самыя рашучыя меры. (ТАСС).

Не паслабляць баявой гатоўнасьці краіны

ЗБОРАМ СРОДКАЎ НА ПАБУДОВУ САМАЛЁТАЎ І ТАНКАЎ, АРГАНІЗАЦЫЯЙ ДОБРААХВОТНІЦКІХ АТРАДАЎ АДКАЗВАЮЦЬ ПРАЦОЎНЫЯ БССР НА ПРАВАКАЦЫЮ КІТАЙСКІХ ГЕНЭРАЛАЎ

АТРАДЫ ДОБРААХВОТНІКАЎ РАСТУЦЬ

На Асінстроі--звыш 200 добраахвотнікаў

26 жніўня ў пас. Выдрыца і Арэхі адбыліся бурныя мітынгі пратэсту супроць усё узрастаючай нагласьці кітайскае ваеншчыны. Прысутныя аднадушна патрабавалі рашучых дзеяньняў з боку савецкага ўраду. Як довад гэтага, пастаноўлена арганізаваць запіс добраахвотнікаў у Далёка-Ўсходнюю Чырвоную армію. **Лік добраахвотнікаў перавысіў 200 чалавек. Пастаноўлена адпраўляць адзін дзень на абарону краіны і падпісацца поўнасьцю на 3-ю пазыку індустрыялізацыі.**

Агульны сход членаў асоавіяхімтрадаў і інструктароў паветрана-хэмічнае абароны і стралковае справы Менакрсавету Асоавіяхіму ў колькасьці 82 чал. просяць камандаваньне БВА прыняць усіх добраахвотнікамі і зараз-жа адправіць у Далёка-Ўсходнюю Чырвоную армію для абароны межаў Савецкага Саюзу.

***

Супрацоўнікі Аршанскага акрвыканкому і судова-сьледчых устаноў у ліку 19 чалавек абвясьцілі сябе мабілізаванымі ў рады Далёка-Ўсходняй Арміі.

Супрацоўнікі цэнтральных і акруговых устаноў сыстэмы сельска-гаспадарчай каапэрацыі у ліку 38 чалавек просяць залічыць іх добраахвотнікамі Чырвонай арміі.

НА ПАБУДОВУ САМАЛЁТАЎ І ТАНКАЎ

Працаўнікі сувязі г. Віцебска пачынаючы з жніўня месяца да канца году адлічваюць адзін процант месячнае зарплаты ў фонд пабудовы самалёту «Чырвоная Сувязь» і выклікаюць усіх працаўнікоў сувязі Беларусі пасьледваць іх прыкладу.

***

Супрацоўнікі цэнтральных і акруговых устаноў **сыстэмы с.-г. каапэрацыі** для ўзмацненьня матар'яльнага становішча Далёка-Ўсходняй Чырвонай арміі адлічаюць 1 проц. ад сваёй пэнсіі за жнівень-месяц, павялічваюць падпіску на 3 пазыку індустрыялізацыі да 150 проц. месячнага акладу пэнсіі, арганізавалі збор сродкаў на пабудову самалёту імя сыстэмы с.-г. каапэрацыі БССР і заклікаюць усіх супрацоўнікаў сыстэмы с.-г. каапэрацыі ўносіць сродкі на пабудову гэтага самалёту

***

Супрацоўнікі калектыву **Гомельскага гарадзкога банку** адлічваюць аднадзенны заработак, заклікаюць усе камунальныя банкі СССР з філіяламі пасьледваць іх прыкладу і на сабраныя сродкі пабудаваць самалёт імя «Камунбанк».

БУДУЕМ ТАНК ІМЯ ГАЗЭТЫ «КАМУНІСТ»

Сход 9-га кіраўніцтва вайсковабудаўнічых работ у г. Слуцку (прыступных 400 чалавек) пастанавіў адлічыць 2 проц. свайго месячнага заработку на пабудову танку імя газэты «Камуніст», якая выдаецца ў Бабруйску.

***

Супрацоўнікі **Сьмілавіцкай Раймілі цыі** адлічваюць аднадзенны заработак на пабудову самалёту «Чырвоны Міліцыянэр» і выклікаюць усе раёны і аддзяленьні міліцыі БССР пасьледваць іх прыкладу. Адначасова выклікаюць на спаборніцтва Пухавіцкую раймілі цыю, для чаго заклікаюць з ёю палітычную ўмову.

***

Рабочыя і служачыя пабудовы Дзяржбанку прызначылі нядзельнік на карысьць фонду абароны краіны, павялічваюць падпіску на 3-ю пазыку індустрыялізацыі, на што выклікаюць усіх рабочых і служачых Беларускага Дзяржаўнага Будаўніцтва і просяць залічыць іх добраахвотнікамі ў рады Чырвонае арміі.

Рабочыя і служачыя пабудоў домбуду і палітэхнікуму просяць на выпадак вайны залічыць іх добраахвотнікамі ў рады Чырвонае арміі, уносяць аднадзенны заработак у фонд абароны і павялічваюць падпіску на 3-ю пазыку. Выклікаюць усіх рабочых і служачых Беларускага Дзяржбудаўніцтва.

ПОРАХ ТРЫМАЦЬ СУХІМ

Агульны сход рабочых і служачых друкарні і рэдакцыі газ. «Зьвязда», заслухаўшы інфармацыю аб становішчы на савецка-кітайскай граніцы, поўнасьцю ўхваляе палітыку савецкага ўраду. Агульны сход адзначае, што, ня гледзячы на ноту нанкінскага ўраду, зьдзекі і прасьледваньні савецкіх грамадзян у Кітаі за апошні час яшчэ больш узмацніліся, што ня спыніліся ўзброеныя напады на савецкую тэрыторыю. Гэтыя выпадкі кажуць, што **нанкінскі ўрад сваёй нотай хацеў усыпіць пільнасьць працоўных мас Савецкага Саюзу.**

Напружанае становішча на савецка-кітайскай граніцы прымушае нас пільна сачыць за падзеямі і быць заўсёды гатовымі да абароны. Порах трымаць сухім. Больш увагі, больш клапатлівасьці да Чырвонай арміі і задач абароны.

Агульны сход студэнтаў, рабочых і служачых Менскага дзяржаўнага палітэхнікуму поўнасьцю ўхваляе адказ Савецкага ўраду на дэклярацыю нанкінскага ўраду.

Мы патрабуем ад нашага

МАБІЛІЗУЕМ МАСЫ КП(б)Б ДЛЯ БАРАЦЬБЫ З ПРАВЫМ АПАРТУНІЗМАМ У ПРАКТЫЧНАЙ РАБОЦЕ

Вакол баявых генэральных лёзунгаў партыі згуртуем шырокія рабочыя масы і павядзем у магутнае наступленьне на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі

Новыя кадры перадавых пралетараў паставім на аванпасты сацыялістычнага будаўніцтва

БАЛЬШАВІЦКАЙ САМАКРЫТЫКАЙ ВЫКРЫЕМ КАНКРЭТНЫХ НАСІЦЕЛЯЎ ПРАВАГА ЎХІЛУ І ПРЫМІРЭНЦАЎ ДА ЯГО

На каго рабіў стаўку НК Асьветы

НК Асьветы Беларусі скажаў клясавую лінію, праводзіў права-апартуністычную палітыку на практыцы

Бальшавіцкія пазыцыі ідэалёгічнага фронту здаваліся клясаваму ворагу

Перад органамі народнае асьветы камуністычная партыя паставіла надзвычай вялікай важнасьці задачы. Важнасьць гэтых задач падвойваецца ў даны пэрыяд, калі партыя намеціла грандыёзную праграму сацыялістычнай перабудовы ўсяе нашае краіны. У пэрыяд, у які партыя праводзіць вялікую работу па сацыялістычным парабудаваньні як гораду, так і вёскі, ад усіх нашых савецкіх, каапэрацыйных, культурных і інш. установаў і арганізацый вымагаецца над звычайная выразнасьць у рабоце, вымагаецца як мага лепшае і поўнае выкананьне дырэктыў нашай партыі. На даным этапе, калі ў сувязі з пасьпяховым сацыялістычным наступленьнем капіталістычныя элемэнты аказваюць шалёнае супраціўленьне, ад усіх нашых савецкіх установаў і арганізацый патрабуецца выразнае праводзьненьне генэральнай лініі партыі. Шырока разгорнутая пралетарская самакрытыка выкрывае на некаторых вельмі важных вучастках нашага сацыялістычнага наступленьня рад прарываў. Наркамзем, самапрамкапэрацыя і, нарэшце, Наркамасьветы—вось пералік тых пруткаў, на якіх у апошнія часы мы мелі гэтыя прарывы.

Народны Камісарыят Асьветы БССР на працягу цэлых гадоў не забясьпечваў правядзеньне генэральнай лініі партыі, вёў права-апартуністычную палітыку. У радзе важнейшых пытаньняў, як камплектаваньне ВНУ, падрыхтоўка навуковых пралетарскіх кадраў і інш. Наркамасьветы не забясьпечыў у практычным правядзеньні выкананьне асноўных установак палітычнай лініі партыі.

Цэлы рад канкрэтных фактаў выразна ад гэтым сьведчыць.

У справе **камплектаваньня** нашых ВНУ і тэхнікумаў Наркамасьветы на практыцы дапусьціў грубыя палітычныя памылкі, скажэньне дырэктыў партыі адносна клясавага падбору студэнтаў і слухачоў навучальных устаноў.

У пачатку бягучага году стыхійна па ініцыятыве пралетарскага студэнцтва ўзьнялася кампанія за ачышчэньне навучальных устаноў ад сацыяльна-варожых элемэнтаў. У часе гэтай кампаніі з Горацкай с.-г. акадэміі быў выключаны студэнт Міхневіч. Гэту асобу можа выразна характарызаваць ліст, які Міхневіч пісаў свайму сябру. Ён пісаў: «Я хачу аўладаць навукай для таго, каб са зброяй у руках адпомсьціцца гэтаму праклятаму бальшавізму за сьмерць майго бацькі». Бачыце, бацька Міхневіча ў 1920 годзе расстрэлены за контр-рэвалюцыю.

Шмат было выяўлена ідэалёгічна варожага, сацыяльна чужога элемэнту ў навучальных установах. Тады і выявілася палітыка Наркамасьветы ў пытаньні камплектаваньня ВНУ на працягу гадоў. Толькі дзякуючы настойлівасьці пралетарскай часткі студэнтэта сапраўды сацыяльна варожыя элемэнты былі выключаны з ВНУ.

ПА АДНЭЙ СЬЦЕЖЦЫ З НАРКАМЗЕМАМ

Калі Наркамзем на працягу гадоў браў курс на моцную кулацкую гаспадарку, то Наркамасьветы зьвяўся дастаўшчыкам спэцыялістых для абслугоўваньня гэтых гаспадарак. Сярэднія і вышэйшыя сельска-гаспадарчыя навучальныя установы, згодна распрацаваных Наркамасьветы праграм, бралі курс, вярней ішлі па шляху падрыхтоўкі спэцыялістых не для калектыўных гаспадарак. С.-г. навучальныя установы не разгортвалі вакол сябе работы па калектывізацыі, не дапамагалі гэтай справе. І ў самой рэчы. Ці-ж можна цярпець такое становішча, **што ў Горацкім раёне с.-г. акадэмія сваім існаваньнем і работай не пакінула ніякіх сьлядоў па калектывізацыі сельскай гаспадаркі.** Акадэмія, налічваючы каля 1.500 студэнтаў і каля 150 навуковых працаўнікоў, ня здолела нічога зрабіць у галіне калектывізацыі. Наркамасьветы аб гэтым нават ня думаў. Між тым, у Горацкім раёне да 1929 году ня было ніводнага калгасу.

Прафэсура акадэміі, тыпу Кісьлякова, дапамагала Наркамзему насаджваць кутары. Ніводнага паказальнага мерапрыемства не правяла акадэмія, накіраванага на ўзрыў цягі сялянства да калектывізацыі!

САБАТАЖ НАРКАМАСЬВЕТЫ Ў СПРАВЕ ПАДРЫХТОЎКІ ПРАЛЕТАРСКІХ НАВУКОВЫХ КАДРАЎ

Лінію Наркамасьветы ў галіне падрыхтоўкі пралетарскіх навуковых кадраў можна проста характарызаваць, як лінію сабатажу. І як-жа інакш назваць тое становішча, што Наркамасьветы на працягу гадоў вусім абходзіў пытаньне аб пралетарскіх навуковых кадрах, а імкнуўся апрануць у вопратку навуковага работніка сацыяльна-чужы элемэнт, клясавага ворага. У лік асьпірантаў траплялі сыны папоў, кулакоў, былых памешчыкаў, белагвардзейцы, і хто вы толькі хочаце, толькі не рабочыя, ня дзеці сялянскай беднаты. Калі ў лік асьпірантаў ці навуковых працаўнікоў трапляў камуністы (а гэта ў практыцы Наркамасьветы было зьявішчам вельмі рэдкім), то ідэалёгічна варожая нам прафэсура складала для яго такія ўмовы, што ён вымушаны быў пакідаць работу. (Прыклад з тав. Дарошкіным у с.-г. акадэміі і інш.). Сацыяльна-ж чужыя элемэнты і інш. высоўваліся Наркамасьветы ў лік навуковых працаўнікоў, у лік асьпірантаў. Падамо адзін з многіх прыкладаў. Дачка папа Карэйша працавала на Аршаншчыне, **але за злоўжываньні і непрацаздольнасьць была зьнята з работы.** Наркамасьветы накіраваў яе ў дасьледчы інстытут на навуковую працу.

Ці можа пралетарская грамадзкасьць цярпець такія факты.

Вязумоўна не. Трэба з усёй рашучасьцю ўдарыць па падобных фактах, **новаму кіраўніцтву Наркамасьветы трэба рашуча ўзяцца за падрыхтоўку навуковых пралетарскіх кадраў.** Новаму кіраўніцтву трэба паставіць справу так, каб у лік навуковых працаўнікоў траплялі рабочыя, батракі і бядняцка-серадняцкая моладзь, выпушчаная нашымі ВНУ. Адначасова трэба паставіць пытаньне і вырашыць у станоўчым сэнсе аб паляпшэньні матар'яльнага становішча асьпірантуры, аб лепшай пастаноўцы навукова-дасьледчай працы.

АБ КІРАЎНІКОХ І СКЛАДЗЕ АПАРАТУ НАРКАМАСЬВЕТЫ

Рад буйных палітычных правалаў у рабоце Наркамасьветы дапушчаны ў выніку таго, што на працягу гадоў на чале гэтай важнейшай установы стаяў тав. Баліцкі, чалавек, які адышоў ад бальшавіцкіх прынцыпаў, які скаціўся да правага апартунізму. Баліцкі, як ужо адзначалася ў «Зьвязьдзе», «па сутнасьці рабіў стаўку на нацыянал-буржуазную інтэлігэнцыю. У пагоні за карыфэямі нацыянал-культурнага руху, ён праглядзеў надрастаючыя пралетарскія кадры». Зусім ня дзіва адсюль тое, што апарат НКА засьмечаны чужымі людзьмі.

Мы ня будзем прыводзіць шмат прыкладаў. Пакажам на адзін. На пасадзе сакратара Галоўнавукі працаваў блізкі чалавек Баліцкага **Сінякоў.** Цэлы рад канкрэтных прыкладаў яскрава характарызуе гэтую асобу. Сінякоў адкрыта выступаў на сходах супрацоўнікаў НКА супроць збору сродкаў на карысьць рабочых-забастоўшчыкаў Лодзі. Ён гаварыў:

— Лодзінскім рабочым жывецца лепш, чым рабочаму ў нас і таму няма чаго ім дапамагаць.

Адносна пэфтаварыства Сінякоў сказаў: «У пэфтаварыства я ўвайшоў мэханічна, а выбываю з яго па ідэалёгічных прычынах».

Аб гэтых «ідэалёгічных прычынах» гаварыць няма чаго, бо кожны пралетар, кожны сьвядомы савецкі грамадзянін ведае, куды яны накіраваны. Ведае таму, што гэтыя «прычыны» выказаны Сінякоўым, які быў членам арганізацыі «Саюзу рускага народу».

На чале Галоўмастацтва знаходзіцца тав. Жылуновіч, аб правых памылках якога мы шмат пісалі.

Гаворачы пра тав. Жылуновіча, як работніка Наркамасьветы, нельга ня спыніцца на тым, што Жылуновіч яшчэ да гэтага часу ня прызнаў сваіх памылак, а нават іх пагыбляе. Ня так даўно на партсходзе пры разборы лісту ЦК КП(б)Б Жылуновіч выступіў в такой «папраўкай».

— ЦК даў дырэктыву весьці рашучую барацьбу супроць тых элемэнтаў, якія ставяць нацыянальную форму вышэй за пралетарскі зьмест—гэта зьяўляецца ляпсусам, бо ня можна супроць паставіць (?) форму зьместу...

Да вылучэнцаў, як мы сказалі вышэй, у Наркамасьветы адносіліся нядбайна, нават тады, калі ў яго сьценах і зьявіліся, нарэшце, два вылучэнцы. Абодва яны це сустракаюць шчырай дапамогі ў рабоце, іх стараюцца абыйсьці. Гэтаму паложыць канец, мы спадзяемся, новае кіраўніцтва Наркамасьветы.

ЯЧЭЙКА ГАНЕБНА БЯЗЬДЗЕЙНІЧАЛА

Пры Народным Камісарыяце Асьветы была ячэйка КП(б)Б. Як-жа яна рэагавала на ўсё тое, што тварылася ва ўстанове, якая ёю абслугоўваецца?

Ячэйка на ўсе гэтыя права-апартуністычныя праяўленьні ў практычнай рабоце НКА адказвала **ганебнай бязьдзейнасьцю.** Ячэйка ня выканала дырэктыў партыі аб разгортваньні самакрытыкі, ячэйка ня **мела бальшавіцкай мужнасьці ўдарыць па работніках рэспубліканскага маштабу, якія сабатавалі правядзеньне генэральнай лініі партыі.** Гэта бязьдзейнасьць давяла ячэйку да таго, што на сходах некаторыя т. т. пачалі патрабаваць распусьціць ячэйку, тлумачачы гэта тым, што ячэйка пры Наркамасьветы непатрэбна. Тав. Слонім заяўляў: «Ячэйцы няма чаго рабіць. Я баюся, што яна абернецца ў кантрольную камісію над работай Наркамасьветы». Пасьля такіх выступленьняў зусім ня дзіва, што пастановы ячэйкі партыйцамі-кіраўнікамі ігнараваліся, што з гэтымі пастановамі ня лічыліся.

У ячэйцы ня была разгорнута самакрытыка. Ня было праверкі выкананьня сваіх пастаноў, не хапала **рашучасьці** праверыць работу абслугоўваемай установы.

Усё гэта патрабуе завастрэньня ўвагі камуністых на пытаньнях разгортваньня самакрытыкі і ўздыму бальшавіцкай пільнасьці, па пытаньнях праверкі выкананьня асноўных дырэктыў партыі.

Усё гэта павінна навочна паказаць партарганізацыям, наколькі пільна трэба сачыць за праяўленьнямі правага ўхілу, наколькі жорстка трэба біць па найменшых спробах тых, хто імкнецца права-апартуністычныя тэорыі прапагандаваць, або ажыцьцяўляць у практычным рабоце.

У. МЯЖЭВІЧ.

Менакрфа абараняў інтарэсы клясавага ворага

Фрунзаўскі райком КП(б)Б не рэагаваў сваячасова на правыя скажэньні ў рабоце ячэйкі

Пастанова прэзыдыуму АКК КП(б)Б

1. На працягу некалькіх год (з 1926 па 1928 г.) у рабоце акрфа мела месца скрыўленьне клясавай лініі, якое выявілася ў неабкладаньні падаткам групы прыватнікаў, больш заможных саматужнікаў, якія карыстаюцца наёмнай сілай, прыслужнікаў рэлігійных культаў і неабкладаньне вайсковым падаткам значнай часткі тылаапалчэнцаў (1926-29 г.). Разлажэньне і сувязь з прыватнікамі часткі знадворнага падатковага апарату акрфа (крэдытаваньне ў пасярэднікаў, сумесныя вечарынкі в імі, растраты, падробкі дакумантаў, п'янства, судовая справа аб злачынствах 16-ці агентаў, сямейнасьць і кругавая парука, пакрываньне растратчыкаў, замазваньне нездаровых зьявішч, выдача няправільных даведак звальняемым супрацоўнікам і г. д.).

Усё гэта гаворыць аб яўным праяўленьні правага ўхілу ў практычнай рабоце акрфа.

2. Паказаныя нездаровыя зьявішчы ня былі сваячасова выкрыты парт'ячэйкай таму, што ў ячэйцы адсутнічала ўнутрыпартыйная дэмакратыя і ня была разгорнута самакрытыка сярод партыйцаў і супрацоўнікаў апарату акрфа. Ячэйка КП(б)Б акрфа не вяла барацьбы за выразнае правядзеньне генэральнай лініі партыі ў практычнай рабоце і не сыгналізавала аб небясьпецы разлажэньня апарату і скрыўленьня клясавай лініі, а таксама ня выканала дырэктыў партыі аб рабоце савецкіх ячэек і ня мела ніякага ўплыву ў рабоце апарату акрфа. З боку Фрунзаўскага райкому КП(б)Б ня было належнага жывога кіраўніцтва работай ячэйкі акрфа, а таксама ня было прынята належных мер папярэджаньня паказаных нездаровых зьявішч у акрфа.

3. Фракцыі мясцкому акрфа і ЦП саюзу саўгандальслужачых не разгарнулі належнай работы сярод беспартыйных супрацоўнікаў апарату акрфа, ня было прынята ніякіх мер да ўцягненьня здаровае часткі беспартыйных служачых у справу паляпшэньня апарату. Не зьявталася належная ўвага на разгортваньне самакрытыкі сярод супрацоўнікаў акрфа, зусім слаба была пастаўлена палітвыхаваўчая работа і зусім слабая рабочая праслойка ў апараце акрфа (толькі 10 проц.).

4. Камуністыя кіраўнікі акрфа (**Вострыкаў і Танхілеўскі**) ня толькі сваячасова не сыгналізавалі перад парторганам аб небясьпецы разлажэньня апарату акрфа, але і самі былі часткова захоплены гэтым разлажэньнем, лічыць, што з боку фракцыі АВК былі праяўлены фармальна бюракратычныя адносіны да кіраўніцтва акрфа.

Выходзячы з вышэйадзначанага, прэзыдыум Мен. АКК КП(б)Б пастанаўляе:

1) Фрунзаўскаму РК КП(б)Б узмацніць жывое практычнае кіраўніцтва работай ячэйкі і прыняць усе захады да зьвішчэньня вышэйпаказаных нездаровых зьявішч.

2) Разгарнуць самакрытыку і ўнутрыпартыйную дэмакратыю ў ячэйцы, завастрыць увагу на барацьбе з правым ухілам і прымірэнчымі адносінамі да яго, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на барацьбу з правым ухілам у практычнай рабоце, выхоўваючы партыйцаў у сэнсе рашучай барацьбы за генэральную лінію партыі.

3) Фрунзаўскаму РК КП(б)Б і ячэйцы акрфа прыняць належныя захады да поўнага выяўленьня нездаровых зьявішч у часе чысткі апарату і ячэйкі КП(б)Б, забясьпечыўшы поўнае ачышчэньне апарату ад асоб, якія разлажыліся і няздольны праводзіць клясавую лінію.

4) Тав. **Вострыкаву,** загадчыку акрфа, за няпрыняцьце мер да зьнішчэньня сувязі часткі працаўнікоў з прыватнікамі, дапушчэньне скрыўленьня клясавай лініі, якое выявілася ў непрыцягненьні да абкладаньня прыбытковым падаткам большасьці прыслужнікаў рэлігійных культаў і неабкладаньня вайсковым падаткам значнай часткі тылаапалчэнцаў, злачынна-нядбайныя адносіны да справы ляснога складу, якія выявіліся ў тым, што пры ад'езьдзе з Менску ня здаў грашовую справаздачнасьць па складу, пакінуўшы яе ў хаотычным становішчы, у выніку чаго частка дакумантаў загінула і ў сучасны момант цяжка ўстанавіць завінавачанасьць установы і прыватных асоб, якія па адных вестках выяўляюцца ў 13.000 руб., а па другіх у 3.000 руб. (25-26 г.) у тым ліку за тав. Вострыкавым лічыцца запазычанасьць у суме 120 руб., за што тав. Вострыкаву абвясьціць суровую вымову з папярэджаньнем і зьняць з працы загадчыка акрфа, забараніўшы на працягу двух гадоў займаць адказныя пасады.

Справу аб лясным складзе перадаць у пракуратуру для правядзеньня сьледзтва ў месячны тэрмін і аб выніках сьледзтва далажыць прэзыдыуму Мен. АКК

5. Тав. **Танхілеўскаму,** былому заг. Менакрфа за няпрыняцьце мер да зьнішчэньня сувязі часткі працаўнікоў з прыватнікамі і скарыстаньне паслуг пасярэдніка па ўзносе падатку ад прыватных асоб, — для падшуканьня сабе кватэры, дапушчэньне скрыўленьня клясавай лініі, якое выявілася ў непрыцягненьні да абкладаньня прыбытковым падаткам служкаў рэлігійных культаў, неабкладаньне вайсковым падаткам значнай часткі тылаапалчэнцаў і замазваньне спраў, за падробкі дакумантаў Сароку і Цэбэргу абвясьціць суровую вымову з папярэджаньнем і лічыць немагчымым пакінуць на адказнай рабоце ў Наркамфіне.

6. Справы аб т.т. **Петрашкевічу, Катковічу В. і Бараўкову** перадаць у партройку на разгляд у іх прысутнасьці, матар'ялы на былога нам. заг. акрфа тав. **Катковіча** перасласць у Полацкую АКК, па месцы яго работы.

У адносінах да тав. **Стрыго** ў сувязі з нанава выяўленым дадатковым матар'ялам па Барысаве, справу аб ім разгледзець дадаткова на пасяджэньні прэзыдыуму АКК у прысутнасьці апошняга.

8. Даручыць пераглядзець акрпракуратуры ў парадку нагляду справы на працаўнікоў акрфа аб 16-ці агентах і інш.

Таксама расьсьледаваць адносна зробленых растрат **Цэбэргам і Сарока.**

У бюро ЦК КП(б)Б

(11 верасьня 1929 г.)

Аб Клімавіцкім раёне

З прычыны таго, што ў Клімавіцкім раёне (Магілеўская акругі) шырока разгарнулася работа па калектывізацыі, Бюро ЦК палічыла патрэбным зьвярнуць асаблівую ўвагу ЦК, Магілеўскага АК і ўсяго савецкага апарату, асабліва НКЗ, Калгасаюзу на ўмацаваньне гэтай работы. У гэтых мэтах Бюро ЦК зацьвердзіла з новага бюджэтнага году спэцыяльную штатную пасаду інструктара пры Клімавіцкім райкоме КП(б)Б. У раён будзе пасланы прадстаўнік ЦК. Усім газэтам запрапанавана ўзмацніць асьвятленьне калгаснага руху ў гэтым раёне.

Аб умацаваньні НКЗ

Бюро ЦК прызнала тэрмінова неабходным узмацніць працаўнікамі-партыйцамі НКЗ. Усім АК КП(б)Б запрапанавана прыняць рашучыя меры да такога-ж узмацненьня акруговых і раённых земорганаў.

На непарыўны тыдзень

Бюро ЦК выказалася за перавод апаратаў ЦК, СНК, ЦСПСБ і ДПУ на непарыўны рабочы тыдзень. Пераход адбудзецца з 1-га кастрычніка. Штаты ня будуць павялічаны.

Курсы і нарады

Бюро ЦК пастанавіла з 1-га студзеня 1930 г. правесьці курсы сакратароў райкомаў.

Аддзелу даручана арганізаваць месячныя курсы па перападрыхтоўцы сакратароў саўгаскіх і калгасных ячэек КП(б)Б, а таксама і сельпарторгаў. Курсы будуць праведзены ва ўсіх акругах. Імі будзе ахоплена 300 чалавек.

На 20-га кастрычніка скліканая нарада сакратароў калгасных ячэек. Парадак дня: 1) аб задачах партыйнай арганізацыі ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, 2) аб становішчы калгасаў і мерапрыемствы па іх умацаваньні, 3) аб партыйнай рабоце ў калгасах (работа ячэек, парторгаў, камсамольскіх ячэек, работа сярод жанчын, масавая работа і інш.).

Бюро парт'ячэйкі НКЗ недапушчальна цярпіма аднеслася да праяўленьняў правага ўхілу

Зямельныя органы укамплектаваць работнікамі, якія на справе могуць забясьпечыць правядзеньне генэральнай лініі партыі

Шырэй разгарнуць самакрытыку ў штодзённай рабоце

Рэзалюцыя сходу парт'ячэйкі НКЗ

Заслухаўшы даклад тав. Рачыцкага **аб праявах правага ўхілу ў практычнай працы НКЗ БССР,** закрыты партыйны сход ячэйкі пры НКЗБ адначае, што на працягу раду гадоў у практычнай працы НКЗБ у правядзеньні зямельнае і сельска-гаспадарчае палітыкі да апошняга часу (да вымены кіраўніцтва ў НКЗБ) меліся наступныя палітычныя скажэньні:

1) У радзе выданьняў НКЗБ (пяцігадовы плян 1925-30 г.); асноўныя моманты зямельнае і сельска-гаспадарчае палітыкі на Беларусі (Прышчэпаў), пасёлкі (апт. тэрыт. і эфэктыўнае з-ня)—выд. НДІ і ў шмат іншых твораў давалася ўстаноўка на разьвіцьцё культурных, а па сутнасьці яўна-кулацкіх гаспадарак, упарта адмаўляючых мажлівасьць разьвіцьця ва ўмовах БССР калектыўных форм с.-г. вытворчасьці і савецкіх гаспадарак. Выходзячы з гэтай кулацкай ўстаноўкі, НКЗ і яго мясцовыя органы ня толькі не дапамагалі разьвіцьцю калгасаў і саўгасаў, а затрымлівалі рух бядняцка-серадняцкіх мас сялянства ў гэтым напрамку, практычна скарачаючы сетку ўжо арганізаваных калгасаў і саўгасаў.

2) Кіраўніцтва НКЗБ і практыка ўсяе зямельнае работы выходзілі з відавочна-памылковае палітычнае ўстаноўкі падзелу разьвіцьця с.-г. на пэрыяды. спачатку разьвіцьця індывідуальнай гаспадаркі з поўным выкарыстоўваньнем асабістай ініцыятывы, пасьля—каапэраваньне і толькі нарэшце—мажлівасьці пераходу да калектыўнае вытворчасьці, а адтэуль—стаўка на хутары, дробныя пасёлкі з адрубнымі формамі, яўна кулацкія нормы зямлянадзяленьня, палажэньня аб культурных (кулацкіх па сутнасьці) гаспадарках.

Кіруючыся гэтымі антыпартыйнымі, антыленінскімі, праваапартуністычнымі ўстаноўкамі, кіраўніцтва НКЗ і практыка ўсяе зямельнае работы паказвае наступныя канкрэтныя праявы правага ўхілу:

а) Стварэньне праз зямляўпарадкаваньне і зямлянадзяленьне 40 проц. хутарскіх гаспадарак ад агульнага ліку зямляўпарадкаванай плошчы. Зямляўпарадкаваньне-ж рэшты сялянскіх гаспадарак праведзена шляхам адрубоў і арганізацыі дробных пасёлкаў (3-5-10 двароў), якія зараз перашкаджаюць пасьпяховай калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Нават пасьля XV партыйнага зьезду на працягу 1928 году з агульнай зямляўпарадкаванай плошчы 18 проц. прыпадае на хутары.

б) Выданьне НКЗБ дзьвёх норм зямлянадзяленьня: мінімальнай і максымальнай, па сутнасьці дзьвёх мінімальных: для беднякоў—5 гэкт., для кулакоў—15 гэкт.

в) Выданьне палажэньня аб культурна-паказальных, а па сутнасьці кулацкіх гаспадарак і ўсямерная ў практычнай працы ахова іх, замест упору на разьвіцьцё калектыўных і савецкіх гаспадарак.

г) Яшчэ нават да 1928 году ўключна праводзілася як ліквідацыя цэлых саўгасаў, так і абрэзка іх замест арганізацыі новых і ўзбуйненьня існуючых, з абсалютна невыстарчальнай практычнай увагай да разьвіцьця старых саўгасаў.

д) Яшчэ і да гэтай пары лясныя фонды, якія перадаюцца ў зямельныя, распыляюцца для надзяленьня індывідуальных гаспадарак, а не выкарыстоўваюцца ў першую чаргу для арганізацыі калгасаў і іх узбуйненьня (перадача 700 гэкт. ляснога фонду ў жніўні месяцы 1929 году ў Стара-Дароскім раёне для індывідуальнага разьмеркаваньня).

е) Бескантрольная здача пазыцый буржуазным спэцыялістым (Кісьлякоў) у распрацоўцы асноўных пытаньняў зямельнае і с.-г. палітыкі (нормы).

ж) Ня гледзячы на стыхійны рух бяднякоў-серадняцкіх мас да калектывізацыі, пасьля XV партыйнага зьезду, НКЗБ да апошняга часу не адмяніў сваіх ранейшых афіцыйных законаў (інструкцыі, абежнікі), якія фактычна тармозяць справу калектывізацыі, што на мясцох вядзе да заблытанасьці ў практычнай працы.

з) Прызнаць, што антыпартыйная дзейнасьць кіраўніцтва НКЗ на чале з т. Прышчэпавым праводзілася пры абсалютна невыстарчальнай увазе да гэтых пытаньняў і без усякага адпору з боку ячэйкі. Бюро і ячэйка ў цэлым зусім недапушчальна цярпіма аднеслися да антыпартыйных паводзін Прышчэпава.

1) Прышчэпаў за час свайго кіраўніцтва ў НКЗБ праводзіў яўна кулацкую лінію, ашукваў давер'е партыі і за апошні час зусім адарваўся ад партыйнага жыцьця. Усю справу кіраўніцтва, падбору і камплектаваньня пэрсаналу праводзіў ізалявана ад партыйнае ячэйкі.

к) Бюро ячэйкі, давёўшы да вых ЦК КП(б)Б аб паслабленьні кіраўніцтва НКЗБ пасьля XII зьезду КП(б)Б і настроях «пакінуць работу» з боку адказных працаўнікоў, аднадушна і рэзка асудзіўшы ўсёй ячэйкай антыпартыйныя погляды Лабаноўскага, не аддала барацьбе з канкрэтнымі праявамі правага ўхілу ў НКЗБ цэнтральнага месца ў сваёй рабоце.

Аднак, ня гледзячы на такое палітычна-няправільнае кіраўніцтва НКЗ у сельскай гаспадарцы, дзякуючы прынятым рашучым мерам з боку ЦК КП(б)Б, ёсьць значныя дасягненьні, вялікі масавы рух бяднякоў-серадняцкіх мас да калектывізацыі, значнае ўзмацненьне савецкіх гаспадарак, рост пасёўных плошчаў, уздым ураджайнасьці і рост жывёлагадоўлі, уздым набрабыту бяднякоў-серадняцкіх мас, што рашуча адхіляе разважаньні правых аб дэградацыі сельскай гаспадаркі.

Катэгарычна асуджаючы яўна кулацкую, права-апартуністычную, антыпартыйную лінію, праведзеную ў практыцы працы НКЗБ (па зьмены кіраўніцтва) на разьвязаньне капіталістычных элемэнтаў у вёсцы і затрыманьне разьвіцьця сацыялістычнага сэктару, мабілізуючы ўвагу кожнага камуністага праявіць самаахвярную актыўнасьць для перамогі правага ўхілу ў практыцы і ідэалёгіі, рашуча разгортваючы самакрытыку ва ўсёй рабоце ячэйкі, агульны сход прызнае патрэбным:

1. Пераглядзець увесь пяцігадовы плян разьвіцьця сельскае гаспадаркі ў частцы калгаснага і саўгаснага будаўніцтва ў бок пашырэньня калектывізацыі як мінімум да 35 проц. пасеўнае плошчы, і падвяньне плошчы пад саўгасамі да канца пяцігодзьдзя. Спыніць распыленьні лясных фондаў не для мэт калектывізацыі і ўзбуйненьня саўгасаў.

2. Пераглядзець пяцігадовы плян падрыхтоўкі кадраў для сацыялістычнага сэктару, улічваючы максымальны тэмп калектывізацыі.

3. Безадкладна адмяніць ва ўстаноўленым савецкім парадку законы, якія затрымліваюць рух калектывізацыі.

4. Бюро ячэйкі замацаваць і ўзмацніць узяты правільны курс канцэнтраваньня працы ячэйкі на асноўных пытаньнях саўгаснага і калгаснага будаўніцтва і сацыялістычнай рэканструкцыі ўсяе сельскае гаспадаркі, арганізуючы непасрэдны ўдзел і адказнасьць кожнага камуністага за поўнае выкананьне плянаў у гэтай галіне.

5. Бюро ячэйкі рашуча паставіць задачу арганізацыі глыбокага вывучэньня ўсімі членамі ячэйкі тэорыі аграрнае палітыкі кампартыі, з поўнай увязкай з аналізам практыкі яе правядзеньня. Гэтую працу максымальна поўна ўвязаць з усёй працай па падрыхтоўцы камуністых-аграрнікаў.

6. Бюро ячэйкі і т. Рачыцкаму яшчэ раз пераглядзець склад працаўнікоў НКЗБ з пункту погляду ўкамплектаваньня пэрсаналам, здольным на справе выконваць задачы партыі на вёсцы, а таксама паставіўшы пытаньне перад вышэйшымі партыйнымі органамі аб перагляздзе і ўзмацненьні апарату акруговых і раённых земельных органаў.

7. Даручыць бюро ячэйкі ў самы хуткі час абгаварыць пытаньне аб антыпартыйных паводзінах т. Прышчэпава.

8. Агульны сход просіць вышэйшыя партыйныя органы ўзмацніць камуністымі органы, якія плянуюць сельскую і лясную гаспадарку (с.-г. сэкцыя Дзяржплану).

З ГІСТОРЫІ БАРАЦЬБЫ З НАЦЫЯНАЛ-ДЭМАКРАТЫЗМАМ

НАЦЫЯНАЛ-ШАВІНІЗМ ПАД МАСКАЙ БАЛЬШАВІЗМУ*)

Пачынаючы, прыкладна з 1925 году, нацыяналістычная частка беларускае інтэлігэнцыі робіць рад спроб «падзяніць» кіраўніцтва палітыкай культурнага будаўніцтва паміж сабою і пралетарыятам. Адна з такіх спроб атрымала ў свой час легальнае выражэньне ў выступленьні на старонках савецкага друку д-ра Трамповіча 2). Потым, калі яна нацярпела няўдачу, пасьледаваў рад яскравых нацыяналістычных выступленьняў гэтай часткі інтэлігенцыі на акадэмічнай канфэрэнцыі па рэформе беларускага правапісу—у Менску 3), выявіўшы сабою: 1) яе культурную арыентацыю не на СССР, а на буржуазны Захад (прапанова аб пераводзе беларускае азбукі з кірыліцы на лацініку і інш.) і 2) дэманстрацыйную тэндэнцыю аддаць прымат «наогул» нацыянальнаму, паставіць нацыянальнае вышэй клясавага (упрыгожаньне залі канфэрэнцыі ў выключна нацыянальных танох, адсутнасьць нават партрэта Леніна, чырвоных сьцягаў і інш.). Апошняя тэндэнцыя проста рэакцыйная і надзвычайна характарная тым, што выкрывае палітыку нацыяналістычнай часткі беларускай інтэлігенцыі аслабяніцца ад гегемоніі пралетарыяту ў культурным будаўніцтве.

Факты—роч упартая. Яны настойліва пратэстуюць супроць іх мэтафізычнага разуменьня і апэлююць да дыялектычнага мысьленьня і здаровага сэнсу пазнаць іх аснову, паставіць іх ва ўзаемную сувязь з грамадзка-палітычным і эканамічным жыцьцём нашае краіны. Калі мы будзем разглядаць іх у гэтым сьвятле, дык ніякага інакшага мысьленьня тут у марксыстых-ленінцаў быць ня можа. Бясспрэчна, што праяўленьні нацыяналізму маюць сваю дробна-буржуазную падставу, што носьбітамі і выказьнікамі дробна-буржуазнай ідэалёгіі зьяўляецца сацыяльная групоўка, якая называецца—інтэлігенцыяй. Не паддаецца таксама сумненьню, што, асабліва ў нашых беларускіх умовах, гэта інтэлігенцыя прабуе пашырыць сфэру свайго ўплыву і зрабіць нацыск на пралетарыят і нават на паасобныя сацыяльныя групы партыі, асабліва на тыя групы, якія ў сваіх мінулых палітычных паводзінах разглядаліся камуністычнай партыяй, як носьбіты дробна-буржуазнай, нацыяналістычнай, непралетарскай ідэалёгіі, але якія, урэшце, увайшлі ў камуністычную партыю.

Гэтыя групы камуністых—былых беларускіх грамадаўцаў, бундаўцаў і інш.—аб'ядналіся з кампартыяй у першую чаргу не дзеля **клясавых ідэй, а нацыянальнага вызваленьня.** Суб'ектыўна яны сумленна і правільна ўспрынялі працэс Кастрычнікавае рэвалюцыі, які адбываецца пад гегемоніяй пралетарыяту; яны былі захоплены геразімам рэвалюцыі, велічу яе наступальнага ходу і часткова таму прышлі да поўнага прызнаньня агалошаных гэтай рэвалюцыяй бальшавіцкіх прынцыпаў. Але аб'ектыўна ў гэтых груп, выхаваных сваімі ранейшымі партыямі на дробна-буржуазных нацыяналістычных традыцыях, не магла бяз сьледу зьнікнуць іх дробна-буржуазная ідэалёгія. Таму, калі партыя пераможна вывела краіну з грамадзянскае вайны і перайшла да мірнага будаўніцтва, у працэсе сваёй творчай работы пры вялізнай розна-стайнасьці і ўскладненьні форм гэтага будаўніцтва, у паасобных таварышоў не маглі не праявіцца адрыжкі іх ранейшай дробна-буржуазнай ідэалёгіі.

Усё гэта ўскладняе праблему, тым больш, што ранейшыя нацыяналістычныя заблуджэньні, прыстасоўваючыся да новых умоў, становяцца перад намі не ў аголёным, а ў замаскаваным выглядзе: Ідэолёгі нацыяналізму імкнуцца адрадзіць старое **пановаму.** У гэтым галоўная небясьпека.

Для нашага часу характэрна ў гэтым працэсе тое, што нацыяналістычныя тэндэнцыі ідуць па лініі ўзвышэньня нацыянальнага «наогул» перад клясавым. Асабліва наглядна яны праяўляюцца ў спробах ідэалізацыі гістарычнага мінулага дробна-буржуазных нацыяналістычных партый («Бунд», Беларуская Грамада і інш.). У Беларускай гісторыка-рэвалюцыйнай літаратуры ў нашу пару адбываецца свайго роду «пераацэнка вартасьці».

Зьяўляюцца погляды, якія імкнуцца «абальшавізаваць» нацыяналістычныя дробна-буржуазныя партыі.

***

Яшчэ ў мінулым (1926) годзе, у мясцовых беларускіх часопісах «Полымя» № 2 і «Маладняк» № 11 (2) зьявіліся дзьве крытычныя заметкі, на выданую Гістпартам ЦК КП(б)Б кнігу—зобр артыкулаў «1905 год на Беларусі».

Разглядаючы некаторыя думкі, выказаныя ў прадмове рэдактарам гэтага зборніку т. М. Шульманам, рэцэнзэнты перанесьлі ўсю палемічную вострасьць на пытаньне аб адносінах да існаваўшых яшчэ пасьля Кастрычнікавае рэвалюцыі партый: «Бунд» і Беларускай Сацыялістычнай Грамады і выкрылі яўнае імкненьне стварыць у гэтым пытаньні «праблему», якая, бачыце, «яшчэ ня вырашана». У гэтым пункце «глыбокадуманьню» аўтараў заметак ня было канца. Дагаворваліся да таго, што «Беларуская Сацыялістычная Грамада работу сваю вяла пад лёзунгамі марксыцкімі і была партыяй у пераважных момантах марксыцкаю» і г. д.

Але, калі-б на сьцягах БСГ і ў сапраўднасьці краса

Напярэдадні вялікіх бабруйскіх манэўраў

Пад знакам баявога спаборніцтва правядуць часьці манэўраную вучобу

ПРАЦОУНЫЯ БССР ВЫКАНАЮЦЬ СВАЕ АБАВЯЗКІ ПА УЗМАЦНЕНЬНІ АБАРОНЫ КРАІНЫ

Тав. Ягораў аб манэўрах

У гутарцы з нашым спэцкорам на манэўрах, кам. вайскамі БВА т. ЯГОРАЎ паведаміў:

— Манэўры заканчваюць сабою гадавы пэрыяд вучобы і зьяўляюцца экзаменам, дасягнутых у галіне падрыхтоўкі часьцей Чырвонай армії.

З якімі-ж вынікамі гадавое вучобы ўваходзяць войскі БВА да правядзеньня манэўраў?

— Я асабіста назіраў шэраг перадманэўравых занятак на складаныя баявыя тэмы. Цэлявая ўстаноўка вучобы гэтага году адбывалася пад знакам фактычнага ўдасканальваньня чырвонаармейца і начскладу. На працягу ўсяго году войскі акругі плянава разьвівалі на гэтай аснове сваю вучобу. Агульны вынік гэтых занятак, ня гледзячы на шэраг недахопаў, дае поўнае права лічыць, што войскі акругі ня толькі ўсьвядомілі заданьні, але і сталі ўжо на практычны шлях усваеньня ўсіх складаных форм гэтае тактыкі.

Якія-ж заданьні начскладу і байцоў на манэўрах? — Манэўры зьяўляюцца такой вучобай, якая найбольш набліжае войскі да ўмоў баявое запраўднасьці. У гэтым і зьмяшчаецца асноўнае значэньне манэўраў. Зусім натуральна, што гэтыя набліжаныя да баявое запраўднасьці ўмовы манэўраў ставяць высокія вымаганьні начскладу і байцом. На манэўрах захаваньне байца і начальніка павінна быць як у баі, бо толькі так мы можам укараніць у нашу сьвядомасьць, у практычныя чыны — неабходныя навыкі баявой работы.

Рост баявой тэхнікі няўхільна дыктуе і прыроду бою. Машына і броня (авіяцыя, танкі, броня-машыны і інш.),—гэта ня ёсьць тэхніка будучага, а тэхніка сёньняшняга дня. Гэта вымагае ад войска ўменьня выкарыстаць тэхніку і з посьпехам процідзіцаць ёй.

На манэўрах нашы патрабаваньні, у асноўным, будуць зводзіцца да наступнага:

АД БАЙЦА: першае — разуменьне існасьці заданьня, другое — выяўленьне дастатачнай навытаранасьці, трэйцяе — выяўляць находчывасьць і сьмелась дзеяньняў ва ўсіх выпадках баявое абстаноўкі.

АД НАЧСКЛАДУ: першае — выразна кіраваць сваёй часьцю, другое — забясьпечыць поўнае ўзаемадзеяньне ўсіх родаў войск і гатункаў зброі, трэцяе — выяўляць актыўнасьць, ініцыятыву і сьмелась у дзеяньнях.

Баявое сацыялістычнае спаборніцтва, якое пачалося ўлетку г. г., значна дапамагала пасьпеху баявое падрыхтоўкі часьцей БВА. На манэўрах нашы часьці павінны разгарнуць спаборніцтва, дамагаючыся найбольшых посьпехаў на асноўным экзамене нашае баявое падрыхтоўкі.

Задачы чыгуначнага транспарту

(Гутарка з час. намесьнікам упоўнаважанага НКШЗ пры Ўрадзе БССР тав. Каменшчыкавым)

У агульнай сыстэме абароны краіны чыгункі займаюць вельмі важнае месца. Сваячасовае перакідваньне войск і харчу будуць мець не малы ўплыў на посьпех будучых войнаў.

Адсюль у часе манэўраў нам трэба дакладна праверыць падрыхтаванасьць чыгунак для выкананьня баявых задач, якія будуць перад імі пастаўлены.

На што асабліва трэба зьвярнуць увагу? Манэўры павінны даць чыгуначнікам добрую трэніроўку работы ў баявых умовах. Ад нас будзе патрэбна выразная, наладжаная работа ўсіх транспартных арганізацый, сваячасовая падача паражняка, дакладнае выкананьне ўсіх раскладаў, зьвязаных з перакіданьнем войск, павышэньне дысцыпліны і г. д.

Апрача таго, чыгуначныя цэнтры заўсёды будуць аб'ектам нападу наземнага і паветранага праціўніка. Мы павінны скарыстаць манэўры для набыцьця навыкаў як па лініі паветрана - хэмічнай абароны, так і ў галіне ўзмацненьня ўсёй аховы чыгунак і сродкаў сувязі, для якой мэты трэба стварыць спэцыяльныя атрады і групы з рабочых і служачых.

Нарэшце, транспартнікі павінны ўсямерна дапамагчы баявой вучобе Чырвонай арміі шляхам захаваньня іх сіл, прадастаўляючы чырвонаармейцам найлепшыя ўмовы адпачынку, дапамагаючы іх сваячасоваму разьмяшчэньню і інш. Манэўры павінны паслужыць нам добрай практыкай, павінны даць магчымасьць заўважыць нашы слабыя бакі і даць штуршок да новых удасканаленьняў нашага транспарту на шляху ўмацаваньня абараназдольнасьці краіны.

Настаўніцтва і манэўры

(Гутарка з пам. старшыні ЦП саюзу працасьветы тав. Мельнік)

Саюз асьветніка ў Беларусі даў мясцом рад указаньняў аб удзеле настаўніцтва ў манэўрах Чырвонай арміі.

Усе культасьветныя ўстановы раёнаў і асабліва хаты-чытальні і нарадамы павінны прыстасавацьца сваю работу для абслугоўваньня чырвонаармейскіх часьцей. У раёнах манэўраў арганізуюцца сталы даведак.

Настаўніцтва павінна праводзіць шырокую растлумачальную работу сярод насельніцтва аб мэтах і задачах манэўраў, асабліва ў зьвязку з падзеямі на Кітайска-Ўсходняй чыгунцы.

Узмацняюць сваю работу ячэйкі Асоавіяхіму пры нізавых арганізацыях саюзу працасьветы.

Настаўніцтва павінна арганізаваць насельніцтва для сустрэчы Чырвонай арміі.

Для растлумачальнай работы трэба скарыстаць сходы па перавыбарах прафсаюзных органаў асьветнікаў, якія зараз праводзяцца.

Радыё-цэнтр сьпіць

Да гэтага часу радыё-цэнтр ніякай працы не азгарнуў у напрамку падрыхтоўкі грамадзкай думкі да вайсковых манэўраў. У апошнія дні намечана перадаць рад гутарак аб значэньні манэўраў і задачах абарона-здольнасьці краіны для сялянскага і гарадзкога слухача. Акрамя гэтага будзе папулярызавацца задача дапамогі насельніцтва чырвонаармейскім часьцям.

На ўвесь час манэўраў радыё-цэнтрам і паліўправай Беларускай Вайсковай Акругі будзе выдавацца чырвонаармейская радыё-газэта, якая ў поўнай меры будзе інфармаваць насельніцтва аб ходзе манэўраў. Усе чырвонаармейскія часьці забясьпечаны адпаведнымі радыё-ўстаноўкамі.

Ул. Стрыгальскі.

Перад баявой праверкай

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Падрыхтоўкай да манэўраў ахоплена ўся Бабруйшчына. Напярэдадні ўсіх грамадзкіх арганізацый бязумоўна ідзе Асоавіяхім. Акрсавет здолеў сваячасова разгарнуць працу, арганізаваць думку сваёй членскай масы. З посьпехам праводзяцца ў горадзе заняткі батальёна, хэматрадаў. Глеба для іх працы была загадзя падрыхтавана на гарадзкіх прадпрыемствах. І ў выніку акрсавет мае моцны батальён, некалькі хэматрадаў і пастоў паветранага агляду.

Што датычыць раёнаў, дык тут назіраецца стракатасьць. На першым месцы ідзе Жлобін, з ім раўнаюцца Асіпавічы: тут ёсьць атрады, пасты, рыхтуецца сустрэча байцоў, прыкметна ва ўсім ініцыятыва Асоавіяхіму. Апошні горш працуе ў Рагачове, Слуцку. Зусім нічога не зрабілі Старыя Дарогі. Да справы тут падышлі з халадком. Ёсьць прыклады яўнага недапушчальных адносін да працы Асоавіяхіму: калі сакратару Рагачэўскага РК КП(б)Б далажылі аб бязьдзейнасьці райсавету, ён «паспачуваў» толькі—«што-ж рабіць—таварышы перагружаны!» У Старых-Дарогах сакратар райсавету працуе справадам у судзе і нарсудзьдзя з абурэньнем заняўляе: «ці суд, ці Асоавіяхім!» Звычайнае зьявішча: працуе толькі адканы сакратар, прэзыдыум-жа і старшыня—для «ўплыву» і праформы. Адсюль і ўсе недахваты і недаробкі.

Гэта навука на будучае. І акрсавет гэта падхапіў сваячасова: раёны падцягваюцца, ужыты рад мерапрыемстваў да ажыўленьня работы прэзыдыумаў райсаветаў.

Грамадзкасьць акругі шчыра адгукнулася, рытуецца актыўна. Няма таго месца, дзе-б не рыхтавалі падарункаў чырвонаармейцам. У Стрэшыне Жлобінскага раёну толькі на нарадзе актыву сабрана на падарункі 110 руб., збор перакінуўся на ўвесь сельсавет; у Асіпавічах чыгуначны мясцком літаральна завалены мяшэчкамі, пакетамі. Шмат нясуць і горшай, партсыгар, ручнікоў і г. д. За бацькамі тут не адсталі і школьнікі—яны зьбіраюць падарункі, а школу ператвараюць у дом адпачынку чырвонага байца, дзе абслуговаюць яго культурна. У в. Стаўнішча, Бабруйскага раёну, за два дні сяляне сабралі на падарункі 25 руб. і 200 яек. Збор перакідваецца ад двара да двара. Сялянства тэй-жа вёскі чысьціць двары, калодзежы, а ў іншай вёсцы рамонтуюць дарогі, масты, рыхтуюць сена, авёс.

Узьняты настрой сялянства відаць з раду спаборніцтваў, наладжаных паміж вёскамі па арганізацыі сустрэчы Чырвонай арміі. Да гэтых-жа дзён рыхтуецца сялянствам здача калектыўнымі абозамі хлеба, узьняцьцем падпіскі на пазыку індустрыялізацыі.

Рыхтуецца каапэрацыя. Яна вабясьпечвае акругу радыё-перасоўкамі, ларкамі. І на мясцох ініцыятыва ўзьнялася. Усе крамы вабясьпечаны належнымі прадуктамі. Чыгуначная каапэрацыя адчыняе на вакзале чайную, на нэроне пабудавала ларок, будуць курсаваць спэцыяльныя вагоны-крамы.

Усюды відна ініцыятыва, кіраўніцтва партыйных і грамадзкіх арганізацый. І гэта дае свае станоўчыя вынікі—большую арганізаванасьць, плянаваньне працы.

Найлепшым прыкладам у гэтых адносінах зьяўляецца Рагачэўскі раён. Тут для растлумачальнай працы пасланы на вёскі спэцыяльныя брыгады. Па вёсках будуюцца аркі, якія ўпрыгожваюцца кветкамі і зяленінам, вучні пішуць лёзунгі, вуліцы насыпаюцца жоўтым пяском. Сяляне шыюць кісеты, зьбіраюць папяросы, яблыкі—падарункі чырвонаармейцам. Па горадзе Рагачэве рабочыя таксама зьбіраюць сродкі на падарункі. Дэлегаткі гораду Рагачэву дапамагаюць санітарнай сэкцыі ўпрыгожваць горад.

Сялянства Рагачэўшчыны ў знак салідарнасьці з арміяй і пад лёзунгам яе праводзяць масавую калектыўную здачу хлеба. Забалоцкі сельсавет здаў 400 пудоў, па Ціхінскім сельсавеце запісалася сялян на здачу 390 пудоў. У вёсцы «Старое Сяло» выпушчана спэцыяльнае насьценгазэта «Чырвоны Абоз», якая праводзіць спаборніцтва на здачу хлеба.

Падрыхтоўка да манэўраў, да сустрэчы Чырвонай арміі на Бабруйшчыне ідзе дзейна пры надзвычайным ўздыме і актыўнасьці працоўных. І падрыхтоўка гэта ідзе з посьпехам. У яе ўкладзена любасьць і шчырасьць.

Пакажам сваю гатоўнасьць

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). У раёне манэўраў разгарнулася шырокая растлумачальная кампанія сярод насельніцтва.

Сялянства ўзварушылася і рыхтуецца да ўрачыстага спатканьня чырвонаармейцаў. Ставяцца аркі з лёзунгамі. ачышчаюцца вуліцы, упрыгожваюцца будынкі.

Ва ўсіх паселішчах закіпела работа па ачыстцы калодзежаў, на рамонце дарог і мастоў. Ва многіх паселішчах да моманту прыходу часьцей прысьвячаецца арганізацыя калгасаў і розных сельска-гаспадарчых аб'яднаньняў. У большасьці паселішч сялянства арганізуе чырвоныя абозы з хлебам. Пасобныя сяляне прапануюць стварыць абозы з хлебам для здачы Чырвонай арміі.

Асабліва актыўна рыхтуюцца сялянкі. Яны прыбіраюць хаты. Зьнімаюць яблыкі, каб пачаставаць імі чырвонаармейцаў. Арганізуюць групы па дастаўцы малочных прадуктаў і стваральваюць выгады для адпачынку чырвонаармейцаў.

Камсамолія абвясьціла сябе мабілізаванай на ўвесь час манэўраў і актыўна ўдзельнічае ў арганізацыйнай работе. Школьнікі пішуць розныя плякаты, арганізуюць настаноўкі для вайсковых часьцей.

У Гомелі працоўныя таксама актыўна ўдзельнічаюць у аказаньні дапамогі манэўрам. Гарсавет выпучыў групу членаў савету для сувязі з Чырвонай арміяй.

Кулакі прабуюць напырацьць розныя чуткі аб тым, што гэта не манэўры, а вайна, а таму трэба хаваць прадукты і г. д. Але кулацкая агітацыя сустракае дружны адпор з боку беднаты.

Сувязістыя на час манэўраў абвясьцілі сябе мабілізаванымі

Загадчык Беларускай канторы сувязі паведаміў нашаму супрацоўніку па пытаньні падрыхтоўкі да вайсковых манэўраў наступнае:

З працаўнікамі тэлефону і тэлеграфу праведзены некалькі нарад па пытаньні павышэньня якасьці працы. На нарадах асабліва завастрылі пытаньне на патрэбнасьці больш хуткай перадачы тэлеграм, не дапускаючы ў апошніх ніякіх скажэньняў. Ад працаўнікоў сувязі паступілі заявы, у якіх яны сябе на час манэўраў лічаць мабілізаванымі і выказваюць згоду працаваць звыш вызначанага часу без дадатковай аплаты.

Саюспаборніцтва ў Асоавіяхіме

Нарада сакратароў ячэек Асоавіяхіму і вайсковых арганізатараў парт'ячэек г. Менску, якая адбылася гэтымі днямі, пастанавіла:

1. Усямерна разьвіваць сыстэму сацыялістычнага спаборніцтва па ўсіх галінах работы таварыства, пашырыць практыку выкліканьня на спаборніцтвы адных ячэек з другімі. Імкнуцца дасягнуць канкрэтных мэт па асобных галінах работы, апіраючыся ў кожным выпадку на падрыхтоўку думкі мас і актывістых, не дапушчаючы ператвараньня гэтай сыстэмы ў спаборніцтва толькі кіруючых органаў арганізацыі.

2. Дасягнуць у акрсавет матар'ял і зводкі аб сацыялістычным спаборніцтве, усім арганізацыям Асоавіяхіму больш асьвятляць у цэнтральнай прэсе, мясцовых і насьценных газэтах работу як ячэек, так і зробленую работу па сацыялістычным спаборніцтве.

3. Стварыць групы ініцыятараў, прыцягваючы і скарыстоўваючы для гэтага камсамольцаў, членаў Асоавіяхіму. Ставіць перад камсамольскімі арганізацыямі пытаньне аб удзеле ў практычнай рабоце, вядзеньне масавай работы і ўдзел наогул камсамольскай арганізацыі ў сацыялістычным спаборніцтве Асоавіяхіму.

4. Узмацніць практычнае кіраўніцтва сялянскімі ячэйкамі па пытаньнях: вяанізацыі, уздыму ўраджайнасьці, узмацненьні калектывізацыі, заклады паказальных вучасткаў і г. д.

Аблігацыі пазыкі—у сялянскія масы!

Растлумачыць сялянству значэньне пазыкі

Выпускаючы 3-ю пазыку індустрыялізацыі, савецкі ўрад паставіў перад сабой практычную задачу ўцягнуць у справу індустрыялізацыі краіны ўсіх працоўных гораду і вёскі.

1-га сьнежня канчаецца тэрмін, вызначаны для распаўсюджваньня гэтай пазыкі. І ў той час, калі ў горадзе мы ўжо набліжаемся да 100 проц. падпіскі, якая вызначана для гораду, дык на вёсцы агульны процант падпіскі не перавышае 25 проц. з вызначанай для яе даволі нізкай сумы ў 1 з паловаю мільёны руб.

Дзе прычыны гэтай слабасьці?

Прычыны ў поўнай бязьдзейнасьці камісій садзейнічаньня пры сельсаветах і значнай частцы камісій пры РВК. Растлумачальная работа слабая. Шырокім колам сялянства не растлумачана значэньне і карысьць пазыкі як для дзяржавы, так для самога сялянства.

Нам вядомы выпадкі, што, калі друк паведаміў аб пажаданьнях рабочых атрымаць пазыку, працоўнае сялянства таксама па сваіх сходах часта выносіла пастановы прасіць савецкі ўрад выпусьціць пазыку, каб тым самым усяму працоўнаму сялянству разам з рабочай класаю ўдзельнічаць у пабудове сацыялістычнай гаспадаркі.

Гэтыя вельмі карысныя жаданьні не падхопліваліся мясцовымі органамі, не папулярызуюцца зараз камісіямі садзейнічаньня.

Трэба выканаць пастанову цэнтральнай камісіі садзейнічаньня пазыкам ад 28 жніўня г. г., якая гаворыць: «ужыць суровыя меры ўзьдзейнічаньня да ўстаноў і асоб, якія нядбайна адносяцца да рэалізацыі пазыкі, або вядуць супроцьдзеяньне агітацыю».

Трэба, каб падстаўнікі сельсаветаў, в[illegible] якіх усклады абавязак [illegible]ічаць пашырэньню пазыкі, разгарнулі сваю работу ў гэтай галіне [illegible] адбыцьцё грамадзкай павінасьці, а адносіліся-б гэтай справы з усёй увагай—як да задач дзяржаўнага значэньня, як да мерапрыемстваў, спрыяючых і непасрэдна дапамагаючых індустрыялізацыі краіны.

Для правядзеньня растлумачальнай работы ў камісіі садзейнічаньня павінны быць прыцягнуты ўсё грамадзкія і культурныя сілы вёскі і ўвесь сялянскі актыў. Ніводзін больш менш значны сялянскі сход не павінен прайсьці без таго, каб пытаньне аб 3-й пазыцы індустрыялізацыі ня было пастаўлена і абмеркавана.

Кожны селянін павінен ведаць, для якой мэты скарыстоўваюцца сродкі пазыкі. Трэба растлумачыць, у якой меры гэтыя сродкі будуць дапамагаць пераводу ўсяе сельскае гаспадаркі на вышэйшыя формы яе вядзеньня, а разам з гэтым будзе служыць ажыцьцяўленьнем пляну вялікіх работу сацыялістычнай гаспадарцы.

Сташэўскі.

У нас пра пазыку нічога ня чуваць

У нас, у вёсцы Грычына, Грычынскага сельсавету, Самахвалавіцкага раёну, [illegible]ькі ў нас, але і шмат у якіх [illegible]дый на тым [illegible]савету, пра 3-ю пазыку ін[illegible] вёсках сельсавету [illegible]ы нічога ня чуваць. Сельдустрыялізацыі [illegible]ная ячэйка абмежавалася [illegible]савет і партк[illegible]авілі даклад аб 3-й пазыцы, што пас[illegible]лізацыі 20-га ліпеня, калі выносілі пратэст супроць нападу кітайскіх генэралаў на К.-Усх. ч. З таго часу пра пазыку забылі. Да 31-га жніўня ў вёсцы Грычына і ў іншых вёсках сельсавету сярод сялянства не пашырана ніводная аблігацыя 3-й пазыкі. Цікава ведаць, чаго чакае Грычынскі сельсавет.

ПІЛЬНАЕ ВОКА.

Чакаюць, покуль сяляне зьвязуць хлеб

ВОРША, 12-IX. (Наш кар.). Падпіска на 3-ю пазыку індустрыялізацыі прахо[illegible] вельмі слаба, асабліва, сярод сялянства. У Дрыбінскім раёне заданьне выканана на 30,4 проц., у Расьнянскім—на 12,7 проц., а сярод сялян — на 1,6 проц.; у Коханаўскім раёне заданьне выканана на 21,5 проц., а сярод сялян—на 4,37 проц.; у Дубровенскім раёне заданьне выканана на 39,1 проц., а сярод сялян на 5,71 проц. і г. д. Тлумачыцца гэта тым, што райвыканкомы і сельсаветы ня прынялі выстарчальных мер, каб правесьці растлумачальную работу сярод сялянства і чакаюць покуль сяляне зьвязуць хлеб.

Сацыялістычнае спаборніцтва

Не застываць на месцы, а павялічваць тэмп

ПРЫСТАСАВАЦЬ ВЫТВОРЧАСЬЦЬ ДА САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ МЭТАДАЎ ПРАЦЫ, АРГАНІЗАВАЦЬ ПРАВІЛЬНАЕ УЗАЕМАДЗЕЯНЬНЕ ЦЕХАЎ

Гаспадарнікі, уключайцеся ў энтузіязм мас

Некаторыя вынікі па гомельскіх прадпрыемствах

Папярэднія вынікі ходу спаборніцтва на прадпрыемствах Гомельскай акругі паказваюць, што прафарганізацыі аднесьліся да сацспаборніцтва з належнай увагай. Спаборніцтва стала ўжо рэальнай зброяй у барацьбе за ўзьняцьце прадукцыйнасьці працы і зьніжэньне сабекошту прадукцыі.

Выкананьне вытворчых праграм у 3-м квартале ідзе вышэй першых двух кварталаў. На фабрыцы «Герой Працы» праграма выканана ў разьмеры 143,7 проц., на заводзе «Сацыялізм» за першае паўгодзьдзе праграма выканана на 94,5 проц., а ў 3-м квартале—97,5, на заводзе «Адраджэньне» ў 3-м квартале праграма выканана на 139,7, замест 100,5. На заводзе «Рухавік Рэвалюцыі» выпуск малатарань павялічыўся на 28,4 проц. Ёсьць дасягненьні ў Палесдруку, на шпэйнай фабрыцы, на гарбарні і на заводзе «Пралетары».

Сабекошт выпушчанай прадукцыі ў 3-м квартале бягучага году ў сярэднім зьніжан на 11,3 проц., што дало эканомію ў 593.100 руб.

У параўнаньні з мінулым ёсьць зьніжэньне плуму. Прыкладна, на заводзе «Пралетары» плум у пасобных цэхах зьменшыўся на 3-4 проц., а на заводзе «Чырвоны Хэмік» плуму зусім няма.

Па цэлым радзе прадпрыемстваў і заводаў па ініцыятыве рабочых праведзена зьніжэньне расцэнак. На фабрыцы імя Клары Цэткін расцэнкі зьніжаны на 20 проц., пры гэтым заработная плата гэтых рабочых, дзякуючы інтэнсыўнасьці працы, павялічылася на 36,7 проц.

Аднак, ня гледзячы на агульныя паказальнікі аб стане работы, на пасобных прадпрыемствах маем зьніжэньне пасобных паказальнікаў у параўнаньні з мінулым. Так, на заводзе «Пралетары» ў 3-м квартале ёсьць зьмяншэньне прадукцыйнасьці працы на 8,5 проц. Сабекошт павялічыўся па медным ліцьці на 0,3 проц., па чыгунным ліцьці — на 4,4 проц. Плум па чыгунным ліцьці павялічыўся на 55 проц. На фабрыцы «Праца» зусім ня ўлічваюцца прастоі па віне прадпрыемства.

На фабрыцы «10 Кастрычнік» (Рэчыца) у 3-м квартале праграма выканана толькі на 78,3 проц., што ўплывае на выкананьне экспартнага пляну. На заводзе «Сацыялізм», на лесазаводзе імя Томскага і на іншых праграмы ня выкананы на 100 проц.

На некаторых прадпрыемствах замест належнага ўздыму прадукцыйнасьці працы наглядаецца або стабільнасьць, або зьніжэньне. На фабрыцы «Дняпро» ёсьць зьніжэньне на 9,2 проц., на заводзе «Сацыялізм»—на 3,1. Усе гэтыя факты гаворыць аб тым, што на прадпрыемствах яшчэ ёсьць шмат недахопаў.

Асноўная прычына недахопаў заключаецца ў тым, што прафорганы кепска кіруюць сац. спаборніцтвам на прадпрыемствах.

Напрыклад, да гэтага часу ні ў адным саюзе, ні на адным прадпрыемстве не папулярызаваны і не прапрацаваны матар'ялы ЎсеЦСПС аб выніках усесаюзнага агляду вытворчых нарад, якія даюць цэлы рад паказаньняў па паляпшэньні масавай эканомработы на прадпрыемствах. Закон СНК аб пашырэньні правоў вытворчых нарад, аб скарыстаньні ініцыятывы рабочых па паляпшэньні вытворчасьці нідзе не скарыстаны.

Дырэктывы ЦСПСБ аб стварэньні фонду прэміяваньня на прадпрыемствах, ліст ЦСПСБ і ВСНГБ аб правядзеньні конкурсу на прадпрыемствах яшчэ да гэтага часу застаюцца на паперы.

У выніку такога кіраўніцтва на пасобных прадпрыемствах адсталыя групы рабочых слаба зразумелі значэньне спаборніцтва.

Не скарыстана практыка работы ўдарных брыгад. На тых прадпрыемствах, дзе брыгады створаны, апошнія прадастаўлены самі сабе. На сьпіртавым заводзе над работаю брыгад падсьмейвалася частка рабочых. На фабрыцы «Вэзуві» замест арганізаваных 12 брыгад, працуе толькі адна брыгада. Між тым, гэтыя брыгады маглі даць вельмі многа. Так, на фабрыцы «Вэзуві» брыгада дае яскравы малюнак: як можна павысіць якасьць прадукцыі.

Ходу спаборніцтва на прадпрыемствах амаль ніхто не правярае. Актыў прадпрыемстваў часамі стаіць з боку. Так, на фабрыцы «Гэрой Працы» пасобныя актывістыя замест таго, каб быць пачынальнікамі ў гэтай справе, выступалі супроць узьняцьця прадукцыйнасьці працы. У галоўных майстэрнях да гэтага часу гаспадарча-палітычныя дагаворы не аформлены. У 3-м вучастку цэхі Зах. чыгунак адказ, атрыманы ад рабочых Жлобінскага дэпо, на працягу двух месяцаў не даводзіўся да ведама рабочых.

Гаспадарчыя органы таксама не перабудавалі свае пляны да гэй інтэнсыўнасьці працы і ўзмацненьня тэмпу работы. Рабочыя характарызуюць гэта становішча наступным чынам: «Мы ўяўляем прадукцыйнасьць працы, выконваем узятыя на сябе абавязкі, а з боку гаспадарчых органаў ня ўжываюцца меры да стварэньня патрэбных умоў для нармальнага разгортваньня спаборніцтва».

На пасобных прадпрыемствах наглядаецца няўвязка паміж цэхамі. На заводзе «Пралетары» заводакіраўніцтва запрапанавала рабочым сьлясарнага цэху прыпыніць тэмп сваёй работы, бо другі цэх не спраўляўся з работаю. На Добрускай фабрыцы, пасьля павялічэньня хуткасьці самачэрпак, ня былі прыстасаваны іншыя аддзелы, дзякуючы чаму стварыліся вялікія залежы паперы. Пасобныя гаспадарнікі ня толькі ня прымаюць мер да кіраваньня ініцыятывы рабочых, але часта нават перашкаджаюць. На запалкавых фабрыках у Рэчыцы гаспадарнікі гаварылі рабочым аб немагчымасьці выкананьня існуючых вытворчых праграм. На фабрыцы «Дняпро» гаспадарнік запрапанаваў замацаваць існуючую норму выпрацоўкі адымальнага цэху, якая зьяўляецца на 30 проц. ніжэй, чым у сакавіку і красавіку. На прадпрыемствах Жылсаюзу да гэтага часу не праводзяцца адлічэньні тых процантаў, якія рабочыя абавязаліся аддаць шляхам перагляду расцэнак.

На некаторых прадпрыемствах з-за гэтай няўвязкі павялічыліся тэхнічныя прастоі. На заводзе «Калпраца» з-за несвачасовага падрыхтаваньня сырцу прымушана не працавадь бачарнае аддзяленьне ў 22 чал. і прагул іх выклікаў падаражэньне прадукцыі. На заводзе «Пралетары» з-за таго, што гаспадарчыя органы памыліліся ў вызначэньні расцэнак, прадукцыя выробляецца з тоўстага жалеза замест тонкага. На фабрыцы «Праца» праграма не забясьпечана сырцом.

Наогул, некаторыя гаспадарчыя органы бязьдзейнічаюць і не дапамагаюць разгортваньню сацыялістычнага спаборніцтва.

Усе гэтыя недахопы былі паказаны на пленуме акрпрафсавету, на якім прыняты практычныя мерапрыемствы па зьніжэньні выяўленых недахопаў, узмацненьні кіраўніцтва спаборніцтвам прафсаюзамі. На пасобных прадпрыемствах ужо арганізуюцца часовыя кантрольныя камісіі для вывучэньня пасобных працэсаў работы на прадпрыемствах.

В. Ш.

Ад тыў яшчэ застаецца пасыўным

Культурна-масавая работа не садзейнічае саюспаборніцтву.—Насьценгазэта, чырвоная і чорная дошкі зусім не адбіваюць ходу спаборніцтва

Гуту «Працы» на Полаччыне яшчэ ўвесну выклікала на спаборніцтва гута імя Домбаля. Спачатку спаборніцтва ўзварушыла жыцьцё гуты сваёй навіной. Як і ўсюды, пры ўступленьні ў спаборніцтва быў заключаны дагавор ня толькі паміж гутамі ўсёй Савецкай Беларусі, але і ўнутры гуты паміж асобнымі цэхамі. У красавіку месяцы былі скончаны ўрачыстасьці заключэньня дагавароў і інш. і спаборніцтва пачало разгортвацца на практыцы.

Камсамольскі калектыў стварыў ударныя брыгады, наперад абгаварыўшы гэтае пытаньне на агульным сходзе калектыву. Разварушыліся і самі рабочыя, зразумеўшы мэты і задачы правядзімага спаборніцтва. Пачалі выклікаць адзін другога на спаборніцтвы па зьніжэньні прагулаў, на паляпшэньні якасьці прадукцыі, на зьніжэньні браку, бою і інш. Красавік месяц зьявіўся ўзорным наогул ва ўсёй працы гуты. Паменшыліся прагулы, павялічыўся процант выпрацоўкі

У сярэдзіне мая месяца гута спыніла сваю працу для халоднага рамонту і прастаяла паўтара месяца. Пасьля рамонту нечакана для кіраўнікоў гуты здарыўся выпадак антысэмітызму, які пакінуў свой адбітак і на ходзе спаборніцтва. Характэрна тое, што і зараз кіраўнікі заводу часта выстаўляюць, як прычыну невыкананьне якой-небудзь працы, выпадак атысэмітызму. Вельмі часта можна пачуць і ад старшыні заўкому, і ад сакратароў партыйнага і камсамольскага калектыву, і ад адміністрацыі такія словы: «антысэмітызм перашкодзіў».

Гэты выраз зьявіўся свайго роду бедлым бычком, на якім пры неабходнасьці можна выехаць.

Усім ходам спаборніцтва на гуце кіруе агульна-заводзкая вытворчая камісія, якая на пашыраных пасяджэньнях з удзелам рабочых абгаворвае пытаньні, зьвязаныя з вытворчасьцю. Апрача гэтага ёсьць тры цэхавыя вытворчыя камісіі. У ліпені месяцы былі праведзены тры пасяджэньні агульна-заводкай камісіі і па два пасяджэньні цэхавых камісій. Галоўная ўвага накіравана на выкананьне кантрольных лічбаў.

Самі рабочыя гуты ўявілі сабе сэнс спаборніцтва. Калі раней былі гутаркі пра ліпшэйшую нагрузкі, пра тое, што «спаборніцтва адаб'ецца на шыі рабочага», дык гэтага зараз амаль што няма.

За ліпень месяц паволне лічбовых даных па спаборніцтве ёсьць значныя дасягненьні. Вось кароткая табліца, якая паказвае, наколькі выкананы дагавор: вытворчая праграма выканана на 116 процантаў (па дагавору-ж патрэбна было 105), прадукцыйнасьць працы—на 122 проц. (патрэбна было 107), прагулы па няўважлівых прычынах скарацілісь на 35 проц. Толькі процант бою не палізіўся, з прычыны перагружанасьці разводных машын і недахвату кваліфікаваных зборшчыкаў.

Ня гледзячы на гэтыя дадатныя бакі, па правядзеньні спаборніцтва недахопаў на гуце значна больш. Культ-масавая работа ня ўвязана са спаборніцтвам. Ёсьць дошка, на якой павінны адзначацца дасягненьні ї недахопы вытворчасьці; але яна так і застаецца незапоўненай. Насьценгазэты няма. Роля насьценгазэты, асабліва ва ўмовах такога прадпрыемства, дзе працуе каля шасьцісот рабочых, вялікая. Кожнае адмоўнае зьявішча, кожны адмоўны бок павінен мець адбітак перш за ўсё ў насьценгазэце. Але на гуце няма гэтага.

Пэрыядычнае падагульненьне выникаў спаборніцтва (праз пяць-дзесяць дзён) таксама мае вялікае значэньне. Але такое сыстэматычнае падагульненьне ня вынікаў на гуце не практыкуецца. Вынікі падагульваюцца ўжо пасьля адпрацаванага месяца і то са спазьненьнем. А вучоту спаборніцтва паміж асобнымі цэхамі і паміж зьменамі ніхто не вядзе. Камсамольскі калектыў слаба ўяўляе, наколькі ўдарныя брыгады зьяўляюцца прыкладнымі. Пра масавыя рабочыя вечары, прысьвечаныя спаборніцтву, дзе можна было-б падагуліць вынікі, выявіць лепшых рабочых, адзначыць злосных прагульшчыкаў, пра ўсё гэта ніхто і ня думае. За ўвесь час спаборніцтва быў праведзены толькі адзін вечар самакрытыкі дый той ня быў належна падрыхтаваны, ня быў прыстасаваны непасрэдна да пытаньняў спаборніцтва і таму ня даў жаданых вынікаў.

Агулам кажучы, на гуце не адчуваецца таго патасу, таго энтузіязму, які ахапіў рабочыя калектывы другіх заводаў. Праўда, рабочыя гуты сьвядома вышлі на сацыялістычнае спаборніцтва, зразумелі сваю ролю і задачы. Але да гэтага яшчэ патрэбна добрае кіраўніцтва, патрэбен напрамак з такім разьлікам, каб спаборніцтва не праходзіла самацёкам, як гэта адчуваецца зараз.

Калі-ж гэтыя недахопы зьявіцьцаны ня будуць, то ўрачыстасьць заключэньня дагавароў забудзецца, а спаборніцтва застанецца толькі фармальнасьцю. Адсутнічае кіраўніцтва спаборніцтвам з боку партыйнага калектыву. Бюро ячэйкі часамі гэта тлумачыць выпадкам антысэмітызму.

У апошнія часы заўважваецца некаторы зрух. Бярэцца за справу камсамольскі калектыў, ставячы перад сабой рад канкрэтных заданьняў па спаборніцтве, якое патрабуе неадкладнага ажыўленьня.

ТАРАС ХАДКЕВІЧ.

Чаму не забясьпечваецца жыцьцёвасьці ўдарных брыгад

На цацачнай фабрыцы «Адраджэньне» (Менск) працуе каля 650 рабочых. Сацыялістычнае спаборніцтва разгарнулася слабавата. Арганізаваны ўсяго дзьве ўдарныя брыгады (у скульптурным і скульптурна - малявальным пэхах). Была арганізавана брыгада ў лазовым цэху, але яна развалілася па прычыне павялічэньня прастояў.

У скульптурным і скульптурна-малявальным пэхах прадукцыйнасьць працы, дзякуючы спаборніцтву, павялічылася да 25 проц., а ўдарнікі гэтых цэхаў прадукцыйнасьць працы павялічылі нават да 50 проц. Гэтых выкананьняў яны дасягнулі галоўным чынам дзякуючы паляпшэньню працоўнай дысцыпліны (зараз ужо ня бегаюць кожную хвіліну ў буфэт, ня гутараць у часе працы і г. д.). Якасьць прадукцыі таксама крыху палепшылася.

У масьлічным цэху прадукцыйнасьць працы павялічылася нават да 75 порц., а зарплата — да 30 проц.

У сьлясарным цэху зарплата павялічылася да 15 проц., а зьніжэньне сабекошту дасягнула 33 проц.

У рэарганізаваным ліцейным цэху прадукцыйнасьць працы падняслася да 44 проц. Але гэты цэх мае вялікі недахоп. З прадукцыі, што выпускаецца, ёсьць да 50 проц. плуму. Тлумачаць гэта тым, што няма добрага тэхнічнага кіраўніка, а цяперашні тэхнічны кіраўнік зусім мала кваліфікаваны.

Некаторыя цэхі пераведзены на лепшыя мэтады працы. Уведзена спэцыялізацыя працы.

Шляхам шырокай растлумачальнай працы (на агульных сходах, на вытворчых нарадах і інш.) удалося дабіцца значнага паляпшэньня праццдысцыпліны. З прагульшчыкамі вядзецца барацьба (заносяцца на чорную дошку і інш.).

Былі выпадкі, калі хуліганаў і злосных прагульшчыкаў зьнімалі з працы. Як на

Провады польскай рабоча-сялянскай дэлегацыі

15-га верасьня ў 12 гадзін дня ў доме Культуры адбудзецца сход рабочых для провадаў рабоча-сялянскай дэлегацыі Польшчы, Зах. Украіны і Зах. Беларусі. Перад ад'ездам дэлегацыя падзеліцца сваімі ўражаньнямі аб гаспадарчым і культурным будаўніцтве ў БССР.

Наладзім жывую сувязь паміж тэатрамі нацрэспублік

Арганізуем алімпіяды савецкага нацтэатру

Да ўсіх работнікаў тэатру нацыянальных рэспублік, нацыянальных наркаматаў асьветы, партыйных прафсаюзных, грамадзкіх арганізацый, што маюць дачыненьне да тэатру

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

За апошнія гады савецкі тэатр, які ахапляе сваёй мастацка-выхаваўчай работай шматмільённыя масы рабочых, сялян і служачых, зрабіўся адным з магутных рычагоў культурнай рэвалюцыі. Важнейшай умовай яго далейшага росту зьяўляецца стварэньне непарыўнай сувязі паміж работнікамі тэатру ўсіх нацыянальных рэспублік. Між тым, як расійскі (галоўным чынам сталінны) тэатр больш, або менш знаёмы іншым рэспублікам, так і расійскаму глядачу, у той жа час мастацкія дасягненьні найбольш перадавых нацыянальных тэатраў настолькі значныя, што ня толькі могуць быць пастаўлены ў ўрад з лепшымі тэатрамі РСФСР, але і павінны зрабіцца вядомымі шырока за межамі ССР. Даволі ўпамянуць такія тэатры, як тэатры Беразіль, тэатр імя Франка, Беларускі дзяржаўны тэатр, дзяржаўныя тэатры УССР і БССР, тэатр імя Руставэлі і інш., устанаўленьне пастаяннай сувязі, творчай сувязі паміж усімі гэтымі тэатрамі дасьць магутны штуршок разьвіцьцю кожнага з іх і разьвіцьцю савецкага тэатру наогул. Такая сувязь асабліва патрэбна і натуральна ва ўмовах шырока разгорнутага **сацыялістычнага спаборніцтва**, арганічнай часткай якога яна павінна зьяўляцца.

Скліканая Галоўмастацтвам РСФСР, па ініцыятыве творчага аб'яднаньня «Пралетарскі тэатр» нарада з удзелам прадстаўнікоў арганізацый, зьвязаных з тэатрамі, і таварышоў з нацпрадстаўніцтву, аднадушна прызнала неадкладную патрэбу правядзеньня такога спаборніцтва паміж нацтэатрамі і пастанавіла ўзьняць перад усімі рэспублікамі пытаньне аб арганізацыі **штогодных алімпіяд савецкага нацыянальнага тэатру.** Алімпіяда павінна быць месцам сустрэчы лепшых тэатраў СССР, абмену практыкай, вучобы друг у друга, павышэньня кваліфікацыі шляхам правядзеньня лекцый па марксыцкім мастацтвазнаўстве і г. д. Штогодна павінны разьмяркоўвацца ўстаноўленыя прызы рознага характару (тэатрам цалком, за лепшую п'есу, лепшую рэжысэрскую, акторскую работу, лепшае афармленьне, лепшыя формы работы з глядачом і інш.). Вядомая частка выдаткаў па правядзеньні штогодных спаборніцтваў, бясспрэчна, можа і павінна быць уключана ў кульмінную пяцігодку кожнага рэспубліканскага бюджэту, кожнай прафсаюзнай арганізацыі. Але магчыма і трэба арганізаваць тэатральную алімпіяду ў большай частцы на самаапладце шляхам сваячасовай арганізацыі абанэмэнтаў, правядзеньня гастроляй кожнага тэатру ў радзе гарадоў, акрамя алімпіяды, прыцягненьня замежнага турызму і г. д.

Лічачы патрэбным арганізаваць першую алімпіяду савецкіх нацтэатраў не пазьней мая **1930 г.**, нарада пастанавіла зьвярнуцца да шырокай грамадзкасьці, да работнікаў тэатру, друку нацыянальных рэспублік з настойлівым заклікам безадкладна паставіць у парадку дня пытаньне аб тэаалімпіядзе і ўдзеле ў ёй тэатраў кожнай данай рэспублікі; вынесьці гэта пытаньне на абгаварэньне друку, саміх тэатраў, аднаведных арганізацый. Не пазьней лістапада г. г. трэба ўтварыць у кожнай рэспубліцы **грамадзкі камітэт дапамогі тэатральнай алімпіядзе,** каб ужо ў сьнежні можна было склікаць усесаюзную нараду нацыянальных камітэтаў і ўстанавіць парадак і склад удзельнікаў першай алімпіяды. Будучы ўпэўненым, што наш заклік знойдзе гарачы водгук ва ўсіх нацыянальных рэспубліках, мы просім усе мясцовыя камітэты дапамогі ўстанавіць сувязь з Галоўмастацтвам РСФСР.

Па даручэньні нарады: **Л. Абаленскі** (Галоўмастацтва РСФСР), **А. Глебаў** (Творч. аб'ядн. «Пралет. тэатр»). **С. Янскі** (Паўн. прадстаўніцтва УССР).

Аб „клясавай лініі" мазырскай пракуратуры

У барацьбе супроць калгаснага будаўніцтва кулак карыстаецца рознымі мэтадамі. Там, дзе судовыя органы і пракуратура пільна сочаць за клясавымі інтарэсамі і сацыялістычным будаўніцтвам, кулак дзейнічае падпольна, праз сваіх «падпявал» і г. д. А вось у Мазырскай акрузе ён (кулак) дзейнічае адкрыта, бо ў акрузе ёсьць такі бесстронны наглядчык за рэвалюцыйнымі законамі — пракуратура і яе прадстаўнікі: памп ракурора Крыленка і памп ракурора Ельскага вучастку Нічыпарук, да рэчы сказаць, апошні яшчэ вылучэнец.

«Няма складу злачынства» — да такога аўтарытэтнага бываду прышоў тав. Крыленка ў адказ на запатрабаваньне мясцовых партарганізацый Каралінскага раёну прыцягнуць да суровай адказнасьці кулакоў в. Шарынь **за выкідваньне межавых слупоў калгасу** ў в. Шарынь і наогул за розныя перашкоды па зямляўпарадкаваньні калгасу, куды ўвайшлі амаль што выключна беднякі.

Справа калектывізацыі ў Каралінскім раёне ідзе шпаркім тэмпам, за веснавую і асеньнюю пасеўную кампанію арганізавана 9 калгасаў, але-ж пры такой «клясвай абароне» Мазырскай пракуратуры ў беднаты складаецца няўпэўненасьць, на чым баку будзе перамога, ці на баку кулака, ці бедняка.

Партыя на справе вядзе ўпартую барацьбу в канкрэтным праяўленьнем права ўхілу і прымірэнцтва. Пара апартуністых выжыць з Мазырскай пракуратуры і як мага хутчэй.

М.

Нячуваны выпадак цяганіны і зьдзекаў у Полацку

Ліст Абрама Зарэцкага пацьвярджаецца

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Полацкі акругком партыі выдзяліў спэцыяльную камісію для расьсьледваньня лісту Абрама Зарэцкага, які зьмешчаны ў «Зьвязьдзе» № 207 ад 11 верасьня.

Факты, паказаныя ў лісьце, у асноўным пацьвярджаюцца.

Полацкія арганізацыі праявілі бяздушны бюракратызм і цяганіну ў гэтай справе.

Падробнасьці—заўтра.

Полацак ГАЛКІН

Правы ўхіл у бабруйскім гаркамгасу

Бабруйскае аддзяленьне дзяржфінкантролю зацікавілася фінансавай дзейнасьцю гаркамгасу. Калі цяпер знаёмімся з вынікамі агляду — разумеем і знаходзім: фінкантроль меў рацыю цікавіцца.

Гаркамгас практыкаваў выдачу буйных авансаў, а вось наконт апраўданьня іх ён ня так ужо і клапаціўся. Камунгандаль у студзені атрымаў 10 тысяч рублёў на загатоўку матар'ялаў. Аванс дасюль не апраўданы. А матар'ялы? Невядома—мо' і не загатаўляліся... За акружсаюзам запісана салідная сума—108.481 руб. Яму выдаваліся ўсё новыя і новыя авансы, а аб спагнаньні іх, ведама, не клапаціліся. Камунтрэст, прамтрэст, цэрабкоп і інш. шырока і з ахвотай карысталіся «узаемазваротнай» сыстэмай камгасу. Грошы бралі яны з ахвотай, а зварачаць—ахвоты ня было...

Пад «узаемазваротную» сыстэму падпадалі і дэфіцытныя будаўнічыя матар'ялы, як цэгла. Яна выдавалася бяз усякага падліку. Так раздалі 140 тысяч штук цэглы, а каму і колькі невядома.

Больш яркі малюнак дае справа з пеняй. Тут загадчык гаркамгасу Гурло разьвіў сваю лінію ва-ўсю. Гарсавет дазволіў загадчыку гаркамгасу зьнімаць паводле яго меркаваньняў невялікія сумы пені. Пені было 1.401 руб. Гурло зьняў 1.100 руб.—78,5 проц. Гэта значыць, зьнімаліся невялікія сумы. Але і з гэтых зьнятых сум 70 проц. прыпадае на прыватніка. З кіраўніцтва аптэкамі Гурло зьняў 43 кап., з арцелі «Чырвоны Бляхар»—6 кап. А з прыватнікаў, якіх можна налічыць каля двух дзесяткаў, зьнімаў Гурло па 37 руб., па 52 руб., па 57 руб. Пеня здымалася за арэнду лугоў, садоў і нават па патэнтах. Вось вам яркі малюнак праяў правага ўхілу на практыцы.

Гурло сваю лінію ўмела пашыраў і на апарат: ён пакрываў растратчыкаў, нават, злоўленых на месцы ўчынку—на краўзы грошай, дапушчаў поўную базгаспадарчасьць.

Правы ўхілісты ў бабруйскай рэчаіснасьці заслужыў належнай увагі, ён, бяўмоўна, і падзяку належную атрымае.

Ш.

ЗЬВЯЗДА

Амаль фэльетон

Не ўпільнавалі,

або прыгодніцкае вандраваньне паўтарагадовага Анатолія

Няпрытульна выглядае Ворша ў асеньні дажджлівы дзень. Гэтыя пахілыя домікі з падранымі стрэхамі, гэтыя шэрыя, пакрыўленыя ва ўсе бакі платы, гэта мокрая стоптаная трава каля тратуараў,—усё гэта ў раскіслую асеньнюю хлюпоту здаецца такім «чароўным» і «прывабным», што малы паўтарагадовы хлопчык ня толькі ня рвецца з душнае кватэры на двор, але нават з-пад коўдры вылазіць ня хоча...

Так можна пачаць «гісторыю» прыгодніцкага вандраваньня Анатолія Дранеўскага. Можна пачаць і інакш, але працаўніком аршанскіх ясьляй лягчэй ад гэтага ня будзе.

Бацька паўтарагадовага Толіка, працаўнік Аршанскай больніцы Мікіта Дранеўскі, перад тым, як ісьці на работу, меў звычай заносіць свайго сына ў ясьлі. Гэта, напэўна, цягнулася-б аж да «совершеннолетия» Толіка, каб не адна акалічнасьць.

30-га жніўня, як і заўсёды, Дранеўскі пакінуў Толіка ў ясьлях, а сам накіраваўся на работу. А сярод дня Дранеўскі, бягучы па справах службы, раптам наткнуўся на свайго сына, які «гуляў» на беразе Дняпра. Дранеўскі аслупянеў ад жаху, а паўтарагадовы хлопчык, змоклы і скарчанелы, ледзь-ледзь кратаў рукамі і нагамі.

Калі Дранеўскі зьвярнуўся ў ясьлі з запытаньнем, якім чынам яго сын апынуўся на беразе Дняпра, дык яму працаўнікі ясьляй так сама холадна і кісла, як было холадна і кісла на двары, адказалі:

— Белаесце, ён уцёк дамоў.

— А адкуль-жа вам вядома, што абавязкова ён уцёк дадому? Адказу не пачулася.

Аб тым, што паўтарагадовы хлопчык, які толькі пару тыдняў таму назад навучыўся хадзіць, мог на кожным кроку трапіць пад аўтобус, пад каня, або нават мог утаніцца ў Дняпры, аб усім гэтым гаварыць ня варта.

Вось амаль што і канец «гісторыі» вандраваньня паўтарагадовага Толіка. Але фактычна канец гэтай «гісторыі» зьяўляецца, толькі пачаткам гісторыі другой, іменна гісторыі, якую напіша Аршанскі акрана, спэцыяльна для выхавацеляў аршанскіх ясьляй. В-а.

У прэзыдыуме ЦСПСБ

Задачы прафсаюзаў у праверцы гаспадарча-палітычных дагавароў па сацспаборніцтве

На пасяджэньні прэзыдыуму ЦСПСБ (11 верасьня г. г.) была заслухана інфармацыя аб сацыялістычным спаборніцтве. З 1-га па 20-га кастрычніка канчаецца тэрмін гаспадарча-палітычных дагавароў, якія заключаны паміж прадпрыемствамі ў парадку сацыялістычнага спаборніцтва. Сацыялістычнае спаборніцтва ўзьнікла па ініцыятыве шырокіх рабочых мас; зараз яно зьяўляецца масавым рухам рабочае клясы за ажыцьцяўленьне асноўных задач сацыялістычнага будаўніцтва. Ужо зараз адчуваюцца тыя вялізарныя вынікі, якія мае наша прамысловасьць. І ўсё-ж, ня гледзячы на тыя станоўчыя вынікі, якіх мы дасягнулі, ёсьць рад недахопаў і проста няправільнасьцяй у правядзеньні сацспаборніцтва. Прафарганізацыі яшчэ да гэтага часу ня досыць добра ўсьвядомілі сабе значэньне сацспаборніцтва. Вытворчыя нарады і вытворчыя камісіі працуюць слаба, а прафарганізацыі ня здолелі ажывіць іх работу. У выніку дрэннага кіраўніцтва прафарганізацый сацспаборніцтвам колькасныя дасягненьні ў некаторых выпадках адбіваюцца на якасьці прадукцыі і г. д.

Сканчэньне тэрміну дагавароў, а таксама рад недахопаў у працы—усё гэта патрабуе перазаключэньня гаспадарча-палітычных дагавароў, а таксама заключэньня новых. У сувязі з гэтым прэзыдыум ЦСПСБ прапанаве акрпрафбюро і АТЭ ЦСПСБ правесьці шырокую нараду прафактыву. На гэтай нарадзе паставіць інструкцыйны даклад аб значэньні і праверцы гаспадарча-палітычных дагавароў на прадпрыемствах, а таксама аб падрыхтоўцы да заключэньня дагавароў на новы гаспадарчы год. Для гэтай мэты ЦП саюзаў павінны вылучыць з свайго апарату 8 чалавек, а ЦСПСБ—2. Уся работа павінна праводзіцца пры самым непасрэдным і актыўным удзеле самых шырокіх рабочых мас, ударных брыгад і камсамольскіх кадраў. А ўся праверка і заключэньне новых гаспадарча-палітычных дагавароў павінны быць поўнасьцю і ўсебакова адлюстраваны ў друку і скончаны не пазьней 15-га кастрычніка.

В.

Месячнік барацьбы з дзіцячай бяспрытульнасьцю і ўдзел у ім прафсаюзаў

На пасяджэньні прэзыдыуму ЦСПСБ (11-га верасьня) была заслухана інфармацыя аб надыходзе месячніка барацьбы з дзіцячай бяспрытульнасьцю. Выявілася, што т-ва «Прыхільнік дзяцей» працавала ізаляванa. Прафсаюзныя арганізацыі мала дапамагалі ў працы таварыства. Кіраўніцтва і праверка дзейнасьці ячэек т-ва на прадпрыемствах праводзілася слаба. А таму прэзыдыум ЦСПСБ лічыць неабходным узмацніць кіраўніцтва і ўдзел прафсаюзных арганізацый у працы таварыства «Прыхільнік дзяцей». У сувязі з гэтым на агульных чарговых сходах членаў саюзаў на першым месцы стаіць пытаньне аб непасрэднай дапамозе дзецям і барацьбе з бяспрытульнасьцю. На пасяджэньнях мясцкомаў і фабкомаў неабходна заслухоўваць даклады бюро ячэек т-ва «Прыхільнік дзяцей». Неабходна сваячасова патурбавацца аб набыцьці сродкаў для дапамогі дзецям. А для гэтага трэба арганізоўваць у клюбах спэцыяльныя платныя вечары сіламі клюбных гурткоў і інш.

У часе месячніка прафсаюзныя арганізацыі павінны сваю работу праводзіць у кантакце з ячэйкамі т-ва «Прыхільнік дзяцей». Гэта патрэбна для таго, каб арганізацыі таварыства мелі маглівасьць сваячасова вылучаць дакладчыкаў, арганізоўваць выстаўкі і інш. У барацьбу з дзіцячай бяспрытульнасьцю павінны быць уцягнуты найбольш актыўныя рабочыя і работніцы з вытворчасьці, якія павінны праводзіць работу пастаянна і сыстэматычна..

В.

Месячнік барацьбы за пісьменнасьць

З 20-га верасьня па 20-ае кастрычніка па Беларусі будзе праводзіцца месячнік барацьбы за пісьменнасьць.

ЦСПСБ прапанаваў прафсаюзным арганізацыям прыцягнуць пісьменных членаў саюзаў, студэнцтва, настаўніцтва для абслугоўваньня лікпунктаў, групавога і індывідуальнага навучаньня. Для ўзмацненьня фонду ліквідацыі няпісьменнасьці рэкамэндуецца наладзіць пастаноўкі, збор па падпісных лістох і г. д. Павінна быць таксама наладжана сацыялістычнае спаборніцтва паміж калектывамі на 100-процантную ліквідацыю няпісьменнасьці і лепшае абслугоўваньне пунктаў.

16-га верасьня ў Менску адбудзецца спэцыяльная нарада фабкомаў і мясцкомаў па пытаньні аб месячніку барацьбы за пісьменнасьць.

27-га верасьня ў Менску склікаецца агульна-гарадзкая канфэрэнцыя.

Пяць новых цагельных заводаў

У Менску, Віцебску, Магілеве і Гомелі скончылася пабудова 5 новых цагельных заводаў. Менскі завод ужо пушчаны. Новыя заводы будуць выпушчаць 30 мільёнаў цэглы ў год.

У Гомелі кала цагельнага заводу пабудаваны рабочы гардзок. Адкрыта лазьня, сталоўка, клюб. На аховy працы на заводзе выдаткавана каля 60 тысяч рублёў.

З тысячы рублёў на барацьбу з брушным тыфусам

Прэзыдыум гарсавету адпусьціў 3 тысячы рублёў на ўзмацненьне барацьбы з эпідэміяй брушнога тыфусу ў Менску. Пашыраецца заразная больніца, арганізуюцца новыя прышчэпачныя пункты.

Самалёт „Беларускі асьветнік"

На ініцыятыве асьветнікаў прэзыдыум ЦП саюзу асьветнікаў пастанавіў пачаць збор сродкаў на пабудову самалёту «Беларускі асьветнік». На канфэрэнцыях асьветнікаў выносяцца пастановы аб правядзеньні працэнтных адлічэньняў на працягу 3-4 месяцаў для пабудовы самалёту.

Паведамленьні

Дом камуністычнае асьветы выклікае

Дом камуністычнае асьветы імя Карла Маркса з дня адчыненьня перахоўдзіць на бесперапынны рабочы тыдзень і выклікае гэта зрабіць камуністычны клюб імя Леніна, клюб імя Розы Люксэмбург, Дом Камсамолу, Дом працасьветы і ўсе рабочыя клюбы г. Менску

— **ДОМ КАМУНІСТЫЧНАЕ АСЬВЕТЫ ІМЯ КАРЛА МАРКСА.** У суботу, 21 верасьня адчыненьне Дому. А 8 гадз. увеч. адбудзецца вечар партактыву са зьместам: Уступнае слова т. Цэнцыпера, даклад заг. АПАД ЦК т. Сакневіча (аб задачах тэорытычнага выхаваньня партактыву), концэрт.

Білеты атрымаць на парт'ячэйках. Т. т., вылучаных для сувязі з домам, згодна паказаньняў АПА АК., зьявіцца за атрыманьнем білетаў у канцылярыю дому штодня ад 11 да 2 гадз. дня і ад 6 да 9 гадзі увеч.

ДОМ ПЕРАЙШОЎ НА БЕСПЕРАПЫННЫ РАБОЧЫ ТЫДЗЕНЬ. 1. Габінэт партработы адчынены штодня, апрача надзелі і аўторкаў, з 6 да 11 гадз. увеч., па нядзелях і аўторках з 1-й гадз. дня да 6 гадзін увеч.

2. Чытальня Дому адчынена ў тыя-ж гадзіны.

3. Бібліятэка адчынена штодня, апрача нядзелі і аўторкаў, ад 6 да 10 гадз. ув., па нядзелях і аўторках—з 2 гадз. дня да 6 гадз. увеч.

4. Шахм.-шашачны пакой (№ 3) адчынен штодня, ад 6 да 11 гадз. увеч., па нядзелях з 2 гадз. дня да 11. гадз. увеч.

5. Буфэт адчынен штодня ад 6 да 12 гадз. ночы.

Сёньня, а 6 гадз. увечары, у памяшканьні клюбу К. Маркса склікаецца пашыраны парт. актыў Фрунзаўскай раённай арганізацыі па пытаньні аб канкрэтных праяўленьнях правага ўхілу.

Разданыя білеты на 9-IX—г. г. сапраўдныя. Члены ЦК, ЦКК, АК, АКК і РК уваходзяць па сваіх мандатах, астатнія—па білетах, атрыманых у ячэйках.

— **БДУ.** У суботу, 14-га верасьня а 6 гадз. увечары, у памяшканьні БДУ (Земляробскі зав. № 4), у аўдыторыі № 41 адбудзецца нарада партактыву калектыву БДУ.

На нараду запрашаюцца: члены бюро калектыву КП(б)Б, члены бюро факультэцкіх ячэек, навуковыя працаўнікі-партыйцы, члены францыў выканбюро, прафсаюзных і грамадзкіх арганізацый, працаўнікі-партыйцы рэдкалегій і кіраўнікі-партыйцы іншых грамадзкіх арганізацый БДУ.

— **БДУ.** Прафком Праўгасу БДУ у нядзелю, 15-га верасьня г. г., арганізуе нядзельнік на карысьць індустрыялізацыі краіны. Збор студэнтаў праўгасу БДУ роўна а 7 гадзіне раніцы, каля будынку Пэдфаку. (Земляробскі завулак).

Яўка для ўсіх студэнтаў абязкова.

— **ДОМ АСЬВЕТЫ.** Сёньня 14-га верасьня—адчыненьне зімовага сэзону — вялікі канцэрт. Пачатак а 7 г. увечары. Білеты па групкомах і мясцкомах.

У нядзелю, 15 верасьня а 7 г. увеч. —пасяджэньне праўленьня Дому.

— **ДОМ АСЬВЕТЫ.** У нядзелю 15-га верасьня а 8 гадз. раніцы адбудуцца заняткі вайсковага гуртка ячэйкі ЛКСМБ працасьветы. Павінны зьявіцца ўсе камсамольцы.

АПО Фрунзаўскага райкому КП(б)Б паведамляе, што з панядзелку 16 верасьня пачнецца прыём у адзіную райпарт. школу. Сакратаром яч.: Наркамгандлю, Саюзхлебу, заводу «Пралетары», Акадэміі Навук, Наркамзему і міліцыі прапануецца выслаць усіх вылучаных слухачамі школы асоб роўна а 7 гадз. увечары 16 верасьня г. г. у 4-ю савецкую школу па Савецкай вуліцы № 68.

— Кастрычнікавы райком ЛКСМБ паведамляе, што з панядзелак, 16-га верасьня, а 6 з палов. гадзіне ўвечары, у памяшканьні клюбу Розы Люксэмбург (рог. Урыцкага і Карла Маркса), адбудзецца пашыраны пленум райкому ЛКСМБ з шырокім удзелам ячэйкавага актыву з наступнай абвесткай дня:

1) Даклад аб становішчы работы кастрычнікавай арганізацыі.

2) Аб пасобных членах райкому.

На пленум павінны зьявіцца ўсе члены і кандыдаты бюро ячэек, арганізатары груп «лёгкай кавалерыі», пінэрпрацаўніці, эканомпрацаўніці, кіраўнікі ўдарных камсамольскіх брыгад, рэдактары насьценгазэт—камсамольцы і ўсе арганізатары ячэйкавых дабраахвотных груп.

Білеты на пленум для актыву трэба атрымаць у РК ЛКСМБ.

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ

На Савецкай Беларусі

Спаборніцтва паміж рабочымі і сялянамі

ГОМЕЛЬ, (Наш кар.). Рабочыя паляровай фабрыкі «Гэрой Працы» заключылі дагавор з падшэфнай вёскай «Перарост» і калектывам імя Калініна на сацыялістычнае спаборніцтва.

Сяляне вёскі «Перарост» абавязаліся арганізаваць машыннае т-ва, уцягваючы ў яго ў першую чаргу беднякоў, стварыць калгас, закантрактаваць пасевы, арганізаваць малочнае таварыства, здаць лішкі хлеба сельска-гаспадарчай каапэрацыі, падпісацца на 3-ю пазыку і ліквідаваць няпісьменнасьць сярод недарослага насельніцтва.

Калектыў імя Калініна з свайго боку абавязуецца выканаць наступныя абавязацельствы: перайсьці ў працягу гэтага году на статут камуны, засадзіць новы сад і разьвесьці пчалярства, ліквідаваць няпісьменнасьць і павысіць агрыкультурныя веды сяброў камуны.

Рабочыя ф-кі абавязаліся: прыняць матар'яльны ўдзел у пакупцы трактару, шляхам аллічэньня 2-х гадзіннага заработку, адрамантаваць інвэнтар, дапамагаць ім у культпрацы. Акрамя таго, рабочыя бяруцца павялічыць выпрацоўку прадукцыі на 25 проц., зьнізіць сабекошт на 6 проц., зьнізіць брак на 1,5 проц., палепшыць якасьць прадукцыі, павысіць працдысцыпліну і свой культурна-палітычны ўзровень.

Цясьней сувязь з прадпрыемствамі

ГОМЕЛЬ (наш кар.). Акруговая камісія садзейнічаньня дзяржкрэдыту наладзіла рад пасяджэньняў на прадпрыемствах. Пасяджэньне камісіі на абутковай фабрыцы «Праца» палепшыла ход падпіскі на 3-ю пазыку індустрыялізацыі сярод рабочых фабрыкі. Надаўна камісія садзейнічаньня засядала на фабрыцы «Гэрой Працы» ў Добрушы. Чарговыя пасяджэньні камісіі будуць наладжаны на фабрыцы „Вэзуві" ў Нова-Беліцы і ў галоўных майстэрнях.

Робяць справаздачы перад выбаршчыкамі

ВОРША (наш кар.). 1-га лістапада па акрузе распачынаецца справаздача выканаўчых камітэтаў, саветаў і пасобных дэпутатаў перад выбаршчыкамі. Гэтая кампанія будзе закончана да 1-га студзеня.

Членам саветаў, якія ўпаршыню абраны ў саветы, будзе аказвацца дапамога ў справе правядзеньня імі справаздач перад сваімі выбаршчыкамі.

Паступленьне самабкладаньня ідзе дрэнна

ГОМЕЛЬ, (Наш кар.). У акрузе зусім дрэнна пастаўлена праца па спагнаньні самаабкладаньня. На 10-е верасьня спагнана 187.875 руб., што складае толькі 55 проц. усяго заданьня.

З усіх раёнаў акругі плятуцца ў хвасьце Буда-Кашалеўскі раён, выканаўцы толькі 38 проц. прынятае сумы, Брагінскі—43 проц., Гомельскі—48 проц. і Веткаўскі—46 проц.

Камарынскі раён спагнаў 77 проц., Церахоўскі—75 проц., Хойніцкі—75 проц. і Чачэрскі—61 проц.

Для ўзмацненьня працы па спагнаньні самаабкладаньня ў адсталых раёны камандзіраваны працаўнікі акрфінадзелу.

За цкаваньне работніцы

Прыгавар па справе Захарэўскага і Сухарукава

Гомель (наш кар.). Гэтымі днямі ў Гомельскім акруговым судзе разглядалася справа б. начальніка 1 тэхвучастку водапуці Захарэўскага і б. старшыні мясцкому Сухарукава, якія прасьледвалі тэлефаністку водпай тэлефоннай станцыі Шаўчэнка.

Усе абвінавачваньні супроць гэтых асоб на судзе пацьвердзіліся.

Устаноўлена, што Захарэўскі і Сухарукаў, карыстаючыся сваім службовым становішчам, прымушалі тэлефаністку Шаўчэнка ўступаць з імі ў інтымную сувязь.

Атрымаўшы ад Шаўчэнка адпор, яны сталі яе прасьледваць і, урэшце, звольнілі з працы. Шаўчэнка, на зьнёсшы гэтых зьдзекаў, пакончыла ж яцьцё самагубствам.

Захарэўскі прыгавораны на 3 гады зьняволеньня, а Сухарукаў—на адзін год.

Пад суд за нядбайныя адносіны да работы

БАРЫСАЎ (наш кар.). Ня гледзячы на рад прапаноў з боку РВК, Карсакоўскі сельсавет ня прымаў ніякіх мер да сваячасовага спагнаньня с.-г. падатку, а таксама сродка самаабкладаньня за мінулы год. Акрамя таго, гэты сельсавет нядбайна адносіўся да патрэб сялянства, не разглядаючы доўгі час іх заяў. За ўсё гэта старшыні сельсавету вынесена суровая вымова. Сакратар сельсавету зьняты з працы і прыцягваецца да судовай адказнасьці.

У ГОМЕЛІ СЕЮЦЬ НЯЧЫСТЫМ НАСЕНЬНЕМ

ГОМЕЛЬ. (Наш. кар.). Ва ўсіх сяленьнях пачалася асеньняя сяўба.

Ва многіх вёсках сяляне акругі сеюць неадсартаваным збожжам, бо кампанія па ачыстцы насеньня сарвана.

У большасьці раёнаў плян акрзямандзелу выкананы толькі на 15—17 проц. Бедсельтрэст ня выканаў пляну завозу сартыровак жыта.

БДТІ у Гомелі

Гомель (наш кар.). У Гомелі распачаў сваю працу першы Беларускі дзяржаўны тэатр.

Калектыў тэатру ўключыў у плян сваёй працы арганізацыю выездаў на заводы для тэатральных пастановак у часе абедзенных перапынкаў рабочых.

Акрамя таго, работнікі тэатру прымаюць удзел у працы курсаў для павышэньня кваліфікацыі кіраўнікоў мастацкіх гурткоў.

Вылазка клясавага ворага

Віцебск. (Наш кар.) 5 верасьня група кулакоў зрабіла напад на старшыню калектыву «Інтэрнацыянал» (Віцебскі раён) т. **Голубева**, які позна ноччу вярнуўся да дому.

Недалёка ад калектыву ў т. Голубева было зроблена 3 стрэлы. Голубеў цяжка паранены ў грудзі.

Па справе затрымана 8 ч. Крымвышук вядзе тэрміновае расьсьледваньне.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР Музыкальная камэдыя і кам. опэра пад маст. кіраўн. Л. Г. МІРАЕВА.
АПОШНІЯ СПЭКТАКЛІ
Субота, 14 верасьня „Ярмарка невест" у 3-х дзеях Якобі
Пачатак а 8 з пал. гадз.

КІНО-ТЭАТР „Культура"
Гістарычны мастацкі баявік ДЖАНКІ
1-я сэрыя ў 7 частках.
Пачатак роўна а 7 г. увеч. Каса—ад 5 г.

Кіно-сад ЦЫГЕЙСКАЯ ЗОРКА Савецкая, 71.
Новы бытавы фільм НЕ ПА ДАРОЗЕ мастацкая бытавая драма
Звыш праграмы: выступленьне папулярнага сатырыка Л. БРАУНА зусім новы рэпэртуар.
Пачатак а 8 г. 30 м. Каса—ад 7 гадз

КІНО Інтэрнацыянал
Бліскучая камэдыя вытворч. „УФА"
НЯВЕСТА БОКСЭРА
У галоўнай ролі КЭЙЗІЯ ДЭСЬНІ і ВІЛЬМ ФРЫТЧ

КІНО Пралетары
На прычыне вялікага посьпеху—другі тыдзень ПАТ І ПАТАШОН у замежным фільме
СІЛА і ХАРАСТВО
арыгінальная камэдыя ў 6-ці частках.
Пачатак а 7 з пал. гадз. Каса—ад 6 гадз

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр"
Новы фільм БЯСПРЫТУЛЬНЫЯ
Каса адчынена штодня ад 2 гадз. дня.
Пачатак 1-га сэансу а 3 г. 30 х., 2-га—а 5 г.
Цана білета 10 к. Мясцы нумараваныя.

КІНО Спартак
Звыш праграмы гастроль С. Ф. Чорнецкай-Бэнуа выканальніцы сьпеваў новага быту і шутачных народных.
НА ЭКРАНЕ выдатны нямецкі баявік МІЛЬЁН ЗА ВЯЧЭРУ
арыгінальная кіно-п'еса ў 8 частках.
У гал. ролі ОСІ АСВАЛЬД
Каса—ад 5 г. 30 м. Пачатак а 7 г. 15 м.

УВАГА!
па ПАНЯДЗЕЛКАХ
Кіно-тэатры Белдзяржкіно «КУЛЬТУРА», «ПРАЛЕТАРЫ», «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» і «ЮНЫ ПІЯНЭР»
АДКРЫТЫ.
Зьмена карцін па ПАНЯДЗЕЛКАХ.

ПОЛЫЙ ПЕРЕВОРОТ в СЧЕТНОМ ТРУДЕ.
ЗАМЕНА ДОРОГОСТОЯЩИХ АРИФМОМЕТРОВ.
Счетный прибор „ЧЕРНЯК" превращает любые конторские счеты в АРИФМОМЕТР
Сч. пр. „ЧЕРНЯК" дает моментально девять готовых произведений любого числа. Абсолютная точность. Сч. пр. „ЧЕРНЯК" заменяет умножение сложением, а деление вычитанием. Готовых произведений. Скорость работы. Полное отсутствие умственного напряжения, Сч. пр. „ЧЕРНЯК" производит вычисление процентов, переводит метрические меры в русские и обратно. Дает готовые результаты при умножении на дроби с однозначным знаменателем. Простота в работе. Бесшумность. Сч. пр. „ЧЕРНЯК" необходим бухгалтерам, счетоводам, таксировщикам, инженерам, техникам, десятникам, прорабам, конструкторам и вообще всем, чья работа связана с точными расчетами. К каждому прибору прилагается полное руководство: для ознакомления последним нужно не больше 25-30 мин.
Цена прибора 15 руб. без пересылки и упаковки.
Прибор высылается по получению задатка в размере 50 проц. Приславшие всю стоимость вперед за пересылку не платят.
МОСКВА, Крымский пер. д. № 3-5. Тел.:Замоскв. 1-31. Заказы и корреспонденции, адресовать: МОСКВА:—Почтамт почт. ящ. 875-22.
Т-ву „Изобретатель-Рационализатор".
К сведению изобретателей: Т-во „Изобретатель-Рационализатор" организовано специально для эксплоатации изобретений. К реализации прин. рентабельные изобретения массового характера.

Тыраж пазыкі ўзмацненьня с.-г. у Ветрыне

Полацак. (Наш кар). З 13 па 15 кастрычніка ў м. Ветрына адбудзецца 4-ы тыраж другое пазыкі ўзмацненьня сельскай гаспадаркі. Усяго будзе разыграна 1,386 выйгрышаў на 87.500 р.

Новы каніфольны завод

НОВА-БЕЛІЦА (наш кар.). У Нова-Беліцы заканчваецца абсталяваньне каніфольнага заводу, які будзе лічыцца другім у ССР па выпрацоўцы каніфолі. Сыравінай і збытам прадукцыі завод забясьпечаны.

Экскурсія калгасьнікаў

ГОМЕЛЬ (Наш. кар.). Група калгасьнікаў у складзе 13 чалавек пад кіраўніцтвам агранома Федарчэнкі выяжджае ў Маскоўскую і Цэнтральна-Чорназёмную вобласьці. Калгасьнікі будуць знаёміцца там з працаю калгасаў.

Кантрактацыя пасеваў на Барысаўшчыне

Барысаў. (Наш кар.). Плян кантрактацыі пасеваў на Барысаўшчыне выкананы на 105 проц. Наперадзе ідзе барысаўскае крэдытнае т-ва, якое закантрактавала пасеваў на 50 гэкт. звыш вызначанае нормы для кантрактацыі.

Невыстарчальная колькасьць мінэральнага ўгнаеньня не дае магчымасьці здаволіць жадаючых закантрактаваць свае пасевы. Калгасы і с.-г. арцелі здаволены штучнымі ўгнаеньнямі поўнасьцю.

Курсы для бядняцкага актыву

ВОРША (наш кар.). Усе райвыканкомы Аршаншчыны праводзяць з 1-га кастрычніка па 1-ае лістапада курсы-нарады сельсаветаў, на якія будзе ўцягнуты батрацкі, бядняцкі і сярадняцкі актыў, а таксама жанчыны-дэлегаткі.

У практычную працу па правядзеньні гэтых курсаў уцягваюцца працаўнікі палітасьветных устаноў і настаўніцтва вясковых і раённых школ.

1-га кастрычніка пачынаецца перарэгістрацыя паляўнічых
Перарэгістрацыя членаў саюзу паляўнічых на 1930 год праводзіцца бюро раённых калектываў з 1 кастрычніка 1929 г. па 1-га студзеня 1930 году.
Тыя, што не перарэгіструюцца ў гэты тэрмін, лічацца вы